ЛіМ

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 32 (5137) 13 жніўня 2021 г. ISSN 0024-4686

16+

*Амаль класік Петрашкевіч* стар. 4

*Прадаўжальнік нацыянальнай паэзіі* стар. 10

*Віцебск: паслядоўнікі авангарда* стар. 12

# Нотны радок, падобны на крылы

*Фота БелТА.*

*Ігар Лучанок. Стваральнікі праекта: скульптары Іван Міско, Аляксандр Фінскі і архітэктар Віктар Крамарэнка.*

Паэтычны, узнёслы, элегантны, пластычны і разам з тым лаканічны і просты — такім бачыцца мемарыял, падораны народным мастаком Беларусі Іванам Міско іншаму народнаму — артысту Ігару Лучанку. Стваральнікамі праекта таксама выступілі скульптар Аляксандр Фінскі і архітэктар Віктар Крамарэнка. Вобраз музыканта, увасоблены ў бронзавым бюсце, перадае стан гранічнай засяроджанасці, шчырасці і сканцэнтраванасці на нечым далёкім, незямным — быццам душа творцы падчас працы вандруе ў нябеснай прасторы, натхнёная Боскай гармоніяй гучання вышэйшых сфер.

Уражанне ўзмацняецца, калі глядзіш на сімвалічны вакальны радок, які, нібыта крылы, абгінае помнік — гэта ноты з песні «Мой родны кут», што стала адной з самых пазнавальных і ўвайшла ў залаты фонд беларускай фанатэкі. Надмагільная пліта ў выглядзе века раяля, пастамент — усё выканана ў цёплым бардовым адценні. Гэта нагадвае пра ўздзеянне, якое пакідаюць на людзей песні, напісаныя Ігарам Лучанком, — яны абуджаюць самыя тонкія пачуцці, закранаюць патаемныя струны душы і натхняюць верыць у дабрыню і вечнасць.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 21032

## «ЛіМ»-акцэнты

**У Палацы Незалежнасці 9 жніўня адбылася «Вялікая размова з Прэзідэнтам», удзельнікамі якой сталі амаль 300 чалавек. Усяго ж на сустрэчу з беларускім лідарам было пададзена каля тысячы заявак, прычым трэць з іх — ад прадстаўнікоў замежжа, паведаміла БелТА. Якія галоўныя адметнасці гэтай знакавай падзеі?**

• «Вялікая размова з Прэзідэнтам» стала самым працяглым мерапрыемствам такога фармату, якое доўжылася амаль 8 гадзін 15 хвілін. Удзельнікі не абмяжоўваліся толькі пытаннямі, але і выступалі з ініцыятывамі, выказвалі свой пункт гледжання, дыскутавалі адзін з адным і з Кіраўніком дзяржавы.

• Напачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што тэм для адкрытага дыялогу і абмеркавання назбіралася сапраўды шмат. «Таму сёння патрэбна гэтая размова — у прамым эфіры, адкрытая, вочы ў вочы і без купюр», — адзначыў Прэзідэнт. Прамую трансляцыю вялі каля 20 медыярэсурсаў Беларусі, Расіі і Украіны, у тым ліку на англійскай мове.

• Пытанні, якія прагучалі падчас сустрэчы, датычыліся ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Беларусі. Аднак размова ішла не толькі пра палітыку, але і пра развіццё адукацыі, удасканаленне сістэмы аховы здароўя, эканамічныя працэсы. Улічваючы сімвалічнасць мерапрыемства (яно праводзілася ў гадавіну прэзідэнцкіх выбараў), шмат пытанняў было пра падзеі 2020 года — на іх Кіраўнік дзяржавы адказваў асабліва падрабязна.

• Асобнай тэмай абмяркоўваліся адносіны з Захадам, процідзеянне санкцыям і сітуацыя на граніцах з ЕС. Госці з-за мяжы пыталіся ў беларускага лідара пра ўзаемадзеянне Беларусі з іх краінамі, у прыватнасці з Расіяй, Украінай, Літвой, Польшчай. Прадстаўнікі заходняй прэсы палічылі неабходным сканцэнтравацца на пытанні аб нібыта пабоях і катаваннях у Беларусі. Прэзідэнт, як і абяцаў, адказаў на гэтае пытанне, прычым не адзін раз.

• Беларусь прайшла сур'ёзнае выпрабаванне на нацыянальнае адзінства. «Ведаем, у нас ёсць усё для таго, каб гэты перыяд у сваёй навейшай гісторыі прайсці годна, — перакананы Прэзідэнт. — Ёсць народ — думаючы, адукаваны, адданы інтарэсам суверэннай Беларусі. Ёсць усеагульнае разуменне таго, што ў сферы нацыянальных інтарэсаў мы ўсе глядзім у адным напрамку — дзяржаўным».

• Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што 2021 год і быў аб'яўлены Годам народнага адзінства таму, што беларусы змаглі захаваць краіну ў барацьбе за свой выбар гістарычнага шляху і сваіх перспектыў. Прэзідэнт падкрэсліў: гэта было б немагчыма без кансалідацыі грамадства ў жаданні і імкненні забяспечыць мір на роднай зямлі. Адзінства беларусаў, паводле слоў Прэзідэнта, прадэманстравала і паспяховая работа Усебеларускага народнага сходу.

• Як прагучала падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», завяршыўся першы этап работы Канстытуцыйнай камісіі, на адрас якой паступіла велізарная колькасць прапаноў па ўдасканаленні Асноўнага закона. «Заўважу, на пераменах настойвалі многія. І тады ўсе ўспрынялі змяненні ў Канстытуцыі як першы, самы галоўны і асноўны крок да перамен. Гэта значыць, на падставе законаў, усё астатняе было б хаосам і беззаконнасцю», — звярнуў увагу Кіраўнік дзяржавы.

• Не вырашым праблемы ў адукацыі — не вырашым ні адной праблемы ў грамадстве. Аляксандр Лукашэнка выразна абазначыў: адукацыя — найважнейшае пытанне. Беларускі лідар падкрэсліў: «І чакаць мы не будзем. З 1 верасня прымем усе рашэнні па навядзенні парадку ва ўстановах адукацыі, выпрацуем адпаведныя стандарты і падыходы». Навучэнцы павінны разумець: менавіта дзяржава бясплатна ўкладвае ў іх веды — падмурак для будучага жыцця.

• Прэзідэнт расказаў, якой ён бачыць Беларусь у будучым: «Хачу, каб у нас была спакойная краіна, усё астатняе мы купім». Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што спакой можа быць толькі пры наяўнасці нармальнай эканамічнай асновы, людзі павінны мець работу. «Калі чалавек хоча і можа, ён у Беларусі заўсёды заробіць. Хто не можа — мы заўсёды падтрымаем такіх людзей», — падкрэсліў беларускі лідар.

**Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ**

**розгалас**

# Зрабіць адпаведныя высновы



**Мікалай ЧАРГІНЕЦ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі:**

— Пасля прагляду «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» адзначыў для сябе тое, у якой добрай фізічнай форме наш Прэзідэнт. Вельмі складана выдатна трымацца на працягу размовы, якая доўжыцца 8 гадзін запар, але Аляксандру Рыгоравічу гэта ўдалося.

Звярну ўвагу на яго жаданне супрацоўнічаць з любымі дзяржавамі на роўных умовах, што і агучыў Прэзідэнт. Галоўнае, каб была павага адно да аднаго і не было таго ціску, які, на жаль, назіраецца апошнім часам. Разважаючы пра суседнія краіны, у прыватнасці пра Украіну, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь заўсёды адкрыта да сяброўства з брацкімі народамі, але для гэтага неабходна добрая воля кіраўніка той ці іншай дзяржавы. Натуральна, была падкрэслена непахіснасць стасункаў з Расійскай Федэрацыяй.

А яшчэ важна тое, што Прэзідэнт паказаў: мы вельмі клапоцімся пра захаванне экалогіі. Гаворка ў тым ліку і пра Беларускую атамную станцыю. Мы гатовы пры любых умовах гарантаваць бяспеку яе дзейнасці. Гэта асабліва важна ў ракурсе прэтэнзій краін-суседзяў.

Адзінае, аб чым я шкадую, што на такія сустрэчы не запрашаюць пісьменнікаў. Ім ёсць што сказаць, бо разважаюць не толькі аб праблемах творчасці, але і эканомікі, міру, узаемаадносін паміж людзьмі… Самае ж галоўнае, што яны здольны ўлавіць настрой насельніцтва і зрабіць уклад ва ўмацаванне краіны, абараняць яе інтарэсы за мяжой. Наша суполка падпісала пагадненні з пісьменніцкімі арганізацыямі з 39 краін. Зыходзячы са шчырай «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», мы зробім адпаведныя высновы для таго, каб умацаваць стан краіны ў сферы культуры і літаратуры, падтрымліваць стасункі з тымі, хто хоча сябраваць з Беларуссю.

Дарэчы, з задавальненнем адзначыў, што Кіраўнік дзяржавы заклапочаны праблемамі адукацыі, у прыватнасці, тым, чым і Саюз пісьменнікаў апошнія чатыры гады, — школьнымі падручнікамі. Гэты факт прымушае Міністэрства адукацыі і Саюз пісьменнікаў сумесна заняцца пытаннямі падрыхтоўкі школьных дапаможнікаў, прынамсі, у сферы беларускай і рускай літаратуры.

# Не — развалу і анархіі!

**Міхась ПАЗНЯКОЎ, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі:**

— Вельмі ўважліва сачыў за сустрэчай Кіраўніка дзяржавы з журналістамі і прадстаўнікамі грамадскасці. Як сын франтавіка і партызанскай сувязной, як грамадзянін і пісьменнік высока цаню мужнасць і рашучасць Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі ў адстойванні выбару пераважнай большасці народа, у барацьбе за мір і шчасце на беларускай зямлі.

Сёння, як ніколі, мы павінны працаваць на яднанне нашага народа, на сувязь паміж пакаленнямі. На стваральнасць, сяброўства і супрацоўніцтва як з суседнімі, так і з далёкімі краінамі. На ўзвышэнне чалавека працы, дабрыні, годнасці, любові — сапраўднага чалавека нашага часу.

Нам ёсць чым ганарыцца, што развіваць і ўмацоўваць! Мы жывём у міралюбнай, працавітай, квітнеючай, цудоўнай краіне. Захаваць яе суверэннасць, парадак і законнасць — наш святы абавязак і клопат. Бачу гэта і ў адметным умацаванні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, што з'яўляецца магутным фактарам захавання незалежнасці, далейшага развіцця эканомікі, дзяржаўнага росквіту, павышэння народнага дабрабыту.

Нястомная праца, пастаянны клопат пра чалавека-стваральніка, належная ўвага да нацыянальнай культуры, вернасць лепшым народным традыцыям, любоў да ўсяго роднага, міралюбнасць і разважлівасць яшчэ больш з'яднаюць нас, накіруюць нашу энергію, нашы сілы і таленты на выдатную, прыгожую будучыню. Галоўнае — працаваць, аддана любіць Радзіму, не здраджваць сваім гераічным бацькам, дзядам і прадзедам.

# Беларусь — міралюбівая краіна

**Аляксандр ХРАМЫ, дырэктар Нацыяльнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь:**

— У кантэксце «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» хачу адзначыць, што для нас, музейшчыкаў, вельмі важна ў сферы культуры ў Год народнага адзінства гэтае адзінства падкрэсліць. Таму ў верасні мы адкрываем выстаўку пад назвай «Ты з Заходняй, я з Усходняй роднай Беларусі», якраз прысвечаную і Дню народнага адзінства, і Году народнага адзінства. Мы збіраемся паказаць памкненні беларусаў да таго, каб нацыя жыла ў адной краіне, дзе забяспечваліся б усе свабоды і магчымасці для развіцця, у тым ліку і людзям іншых нацыянальнасцей, дзе ўтульна пражывалі б прадстаўнікі розных веравызнанняў.

Акрамя таго, у Год народнага адзінства для нас важна развіваць міжнародныя стасункі, каб паказаць, што Беларусь — міралюбівая краіна, што нашы культурныя каштоўнасці вельмі глыбокія і нам ёсць чым ганарыцца. Мы збіраемся прадставіць гэта ў розных краінах, гатовых нас прыняць. Так, у верасні пройдуць Дні культуры Беларусі ў Казахстане — Нацыянальны гістарычны музей вязе туды частку сваёй выстаўкі. Плануем і стасункі з Расійскай Федэрацыяй, і з краінамі Блізкага Усходу — нам ёсць што паказаць. Больш за тое, імкнёмся да таго, каб і ў нас рэалізоўваліся цікавыя міжнародныя праекты.

Музей працуе і над паляпшэннем экспазіцыйных плошчаў, і над стварэннем новых праектаў, якія адлюстроўваюць нашу самабытнасць, глыбіню нашай гісторыі і культуры, паказваюць шматпакутны лёс беларускага народа ў барацьбе за незалежнасць. Гэта і ёсць асноўныя нашы мэты. У годзе, прысвечаным круглай даце з пачатку Вялікай Айчыннай вайны, мы стварылі некалькі прэзентацыйных ролікаў, дзе паказаны ўсе жудасці ваенных падзей, а таксама памкненні беларусаў да мірнага суіснавання са сваімі суседзямі і прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, з якімі мы стагоддзямі пражываем на адной зямлі.

# Разам з народам

**Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:**

— Глядзеў «Вялікую размову з Прэзідэнтам» па тэлебачанні, вельмі цяжка было адарвацца. Бо размова ішла пра нас. Пра нас, учорашніх і сённяшніх, пра наша заўтра. Пра нашы эканамічныя і духоўныя стваральныя поспехі. Вельмі шчыра і адкрыта — пра нашы пралікі. Пра будучыню нашых дзяцей і ўнукаў. Пра дараваную нашай нацыі лёсам-Богам незалежнасць і неабходнасць яе абароны ад нападкаў недобразычлівых заходніх суседзяў. Ды ўжо ад тых, хто перыядычна «цяўкае» на нас з-за мяжы, куды, баючыся расплаты, збеглі — пасля стараннага ўвядзення ў зман часткі беларускага грамадства… А «дзякуючы» ім жа, падкормленым амерыканскімі і еўрапейскімі грашыма, мы сапраўды маглі згубіць самае дарагое — сваю краіну, той лад жыцця, які падтрымліваецца большасцю народа.

Слухаў і глядзеў трансляцыю, а згадваліся гарачыя падзеі жніўня 2020-га. Але не тыя, што адбываліся ў Мінску (мы яшчэ не да канца зразумелі, а што ж там адбывалася і чаму?). Згадвалася палеская глыбінка. Вёска. На полі — вялікі ўраджай, і яго трэба, нягледзячы на пандэмію, сабраць. Каб той жа Мінск пасля неразумнага сноўдання асобных «пакрыўджаных» па вуліцах, ці Гомель, дзе таксама былі на прыступках цырка ці ўнівермага групкі «бедных» студэнтаў, не засталіся без малака, хлеба і бульбы.

І я не бачыў ніводнага не занятага справай палешука. Усе ў тыя дні працавалі, не пакладаючы рук. Хто на грамадскім палетку, а хто на ўласнай сядзібе. Дзеля таго, каб накарміць сваю сям'ю і сваю краіну. Ім, сапраўдным стваральнікам народнага дабрабыту, было не да вылезлых «рэвалюцыянераў», не да тых, хто распальваў інфармацыйную вайну. Менавіта ж яны, хлебаробы, што жывуць з мазаля, падтрымалі законныя дзеянні ўлады, праваахоўных органаў па навядзенні парадку ў нашай міралюбівай і такой шматпакутнай, шматнацыянальнай краіне. Вось тады я не раз чуў ад сваіх землякоў-палешукоў: «Не падабаецца — ніхто цябе тут не трымае, едзь у еўрапейскія далі за абяцанымі смакоткамі, а нам, беларусам, не перашкаджай жыць і працаваць!»

Падзяляю пункт гледжання Аляксандра Лукашэнкі: каб нешта мець, трэба старанна працаваць. Дармовага нічога не было і не будзе. Берагчы сваю краіну, яе незалежнасць ад знешніх нападкаў і ад унутраных адшчапенцаў. Мацаваць сваю эканоміку. Цесна супрацоўнічаць з Расіяй, Кітаем, з тымі краінамі, якія нас падтрымліваюць словам і справай, імкнуцца адраджаць славянскае братэрства, наколькі рэальнасць дае нам такія магчымасці. Мы — дружалюбная краіна.

Але ўсё гэта будзе непатрэбным, калі мы не зможам годна выхоўваць сваіх дзяцей. Як патрыётаў сваёй зямлі. Найпершую ўвагу — ім, нашай будучыні. Не магу не пагадзіцца з Прэзідэнтам: «Па-мойму, пакаленне сучаснай моладзі многага не бачыць і не разумее. Ім патрэбна даносіць, растлумачваць, каб раслі з разуменнем, на якой зямлі жывуць, якія каштоўнасці ім імкнуцца прывіць у інтэрнэце».

Не вырашым праблемы ў адукацыйнай прасторы — не адолеем ніводнай грамадскай праблемы. На мой погляд, выхаваўчы аспект з шырокім прыцягненнем найперш сям'і павінен быць пастаўлены вышэй, чым толькі «аказанне адукацыйных паслуг», што мы маем сёння. І — балючая праблема падручнікаў. Нам трэба адказаць на пытанне: чаму мы іх, адпавядаючых патрабаванням часу, дагэтуль не маем? Ці, можа, іх распрацоўкай займаюцца не тыя людзі? Сапраўды своечасова пастаўлена пытанне: чаму ў асобу ўкладваюцца дзяржаўныя сродкі, а яна, гэтая асоба, адплачвае здрадай?

На мой погляд, шматгадзінная размова Кіраўніка дзяржавы з работнікамі мас-медыя зусім не нагадвала звычайную прэс-канферэнцыю: гэта і па сваім фармаце, і па сутнасці была вялікая размова законнаабранага лідара з усім беларускім народам, бо ў ёй, як у люстэрку, адлюстроўвалася тое, што ў нашай, абкладзенай «санкцыйнымі падарункамі» краіне адбываецца насамрэч, ад чаго нам трэба тэрмінова пазбаўляцца і што набываць. У чарговы раз Кіраўнік беларускай дзяржавы паказаў, наколькі балючыя для яго асабіста тэмы, якія хвалююць кожнага беларуса, кожнага грамадзяніна краіны. З гэтай размовы кожны з нас павінен вынесці: усё мы вырашым мірным шляхам, мы здольныя як нацыя плённа развівацца, рэалізоўваць сябе і свае ідэі.

# Вернасць свайму

**Тамара КРУТАЛЕВІЧ, загадчык аддзела маркетынгу Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Мінскай вобласці:**

— Кранулі сваёй актуальнасцю выказванні Прэзідэнта аб неабходнасці адаптацыі работы па патрыятычным выхаванні моладзі да запатрабаванняў часу — што людзей не размяжоўвае, а яднае ў непарыўнай сувязі з Бацькаўшчынай. Нацыянальную ідэю шукаць не трэба: гэта — вернасць свайму, абарона традыцыйных каштоўнасцей.

Краязнаўства — лепшая форма патрыятызму, духоўны рухавік грамадства, базіс для станаўлення сапраўднага патрыёта. Важна надаць выхаванню моладзі патрыятычны штуршок — не загадваць любіць радзіму, а далікатна падштурхоўваць у патрэбным напрамку: ад пазнання да захаплення сваёй гісторыяй. Каб любіць свой край — трэба яго ведаць. Як аўтар праекта «Краязнаўчы лекторый на колах» упэўнена: такія веды сучаснікам патрэбны, бо яны — найкаштоўнейшае багацце гістарычнай памяці народа, надзейная апора для захавання этнакультурнай самабытнасці.

Таму важна з маленства выхоўваць адукаваных, улюбёных у Бацькаўшчыну людзей: ад радзімазнаўства да радзімалюбства — як малой радзімы, так і ўсёй Дзяржавы. Сёння дзецям не хапае ведаў пра сваю радзіму. Важна, каб у школах вялася належная адукацыя, каб урокі гісторыі не абмяжоўваліся агульнай гісторыяй. Трэба, каб хоць раз на тыдзень ці месяц дзеці знаёміліся з гісторыяй малой радзімы, наведвалі знакавыя мясціны, удзельнічалі ў суботніках па адраджэнні сядзіб і гістарычна-культурнай спадчыны. Праз такое спасціжэнне гісторыя робіцца часткай індывідуальнай памяці, уваходзіць у свядомасць юнай асобы, замацоўваецца ў ёй. Толькі падручнікамі не абыйсціся. Патрэбны рэгіянальныя краязнаўча-асветніцкія праграмы.

Урокі любові да Айчыны не заканчваюцца выпускным балем, яны дапамагаюць чалавеку на любым жыццёвым этапе. Краязнаўчыя экскурсы і лекторыі на колах дазваляюць людзям шырэй паглядзець на родную гісторыю, адчуць гонар за мясціны, дзе жывуць, вучацца, працуюць, адчуць духоўную блізкасць з землякамі.

Студэнцкая моладзь — люстэрка ўсіх сацыяльных, палітычных, маральна-этычных працэсаў, што адбываюцца ў рэспубліцы. Яе настрой і меркаванні — паказчык будучага стану грамадства. Важна, як зазначыў Прэзідэнт, узмацніць ідэалагічныя пастулаты адукацыі, забяспечыць прадуманае ідэалагічнае напаўненне інстытуцкіх планаў і адукацыйных праграм, запазычваць з савецкага вопыту работы з моладдзю, дапамагчы не зблудзіць у гушчы дат і імёнаў. Успамінаецца, як весела мы — студэнты 70-х — хадзілі ў калонах дэманстрантаў на 1 Мая ці 7 Лістапада. І не таму, што нас прымусова гналі на праспект, а таму, што ў масавых акцыях адчувалі сваё яднанне.

Важна захоўваць цэнтральную ідэалагічную лінію — памяць пра Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне і ўсведамленне сябе народам-пераможцам, які пераадолеў цяжкасці і ажыццявіў шматвяковую мару атрымаць незалежнасць. Гэта цэментуе нацыю. Ветэраны, на вялікі жаль, адыходзяць, а маладыя людзі, нягледзячы на выхаваўчыя акцыі ў школах і ўніверсітэтах, пра ваенныя гады ведаюць недаравальна мала.

Агітацыйна-прапагандысцкія акцыі-мерапрыемствы, зладжаныя ўстановамі культуры, важна весці не шаблонна, не эпізадычна, а з арыенцірам на канкрэтныя справы на карысць малой радзімы — сведчанне знакавага праекта бярэзінскіх бібліятэкараў «70 патрыятычных спраў».

Мне, культработніку з 40-гадовым стажам, бачыцца важным выкрасліць з практыкі прэсныя, невыразныя мерапрыемствы. Акцыі, ад якіх нулявая карысць для нацыянальнага інтарэсу, — марная трата часу, намаганняў, сродкаў. Ура-патрыятычныя, фармальныя імпрэзы да юбілейных дат, падобныя да песенек-аднадзёнак, хутка сціраюцца з памяці, не кранаюць розум і сэрца. Важна адаптаваць мерапрыемствы да ўспрымання сучаснікаў і таленавіта падаваць іх у нечаканай інтэрпрэтацыі, каб дапамагчы сучаснікам убачыць землякоў не манументальна ўзнёслымі на п'едэстал, а простымі, блізкімі, зразумелымі — у багацці цікавых звестак, падзей і здзяйсненняў. Сведчанне таму — нашы бібліятэчныя праекты: «Гісторыя раёна ў суквецці дат і імёнаў», «Горад помніць нас маладымі», «Святло знаёмай зоркі».

## «ЛіМ»-люстэрка

Выстаўка «Шлях Пакістана», прымеркаваная да Дня незалежнасці Ісламскай Рэспублікі Пакістан, адкрылася ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», інфармуе БелТА. У экспазіцыі прадстаўлены жывапіс і фотаздымкі, якія адлюстроўваюць хараство прыроды і архітэктуры Пакістана. Можна таксама ўбачыць нацыянальную вопратку і аксесуары, разнастайныя прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія перадаюць нацыянальны каларыт і старажытнасць традыцый. Цэнтр экспазіцыі — карціны Джымі Інжэнера і фатографа Хаміда Хусэйна. Праект арганізаваны Пасольствам Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Рэспубліцы Беларусь сумесна з мастацкай галерэяй «Універсітэт культуры».

Міжнародны арт-фестываль сімвалічнага мастацтва адкрыўся ў Мінскім абласным цэнтры народнай творчасці. Тэма сёлетняга фэсту — «За мяжой свядомасці ляжыць новая рэальнасць». У экспазіцыі прадстаўлены работы беларускіх і расійскіх майстроў, якія працуюць у розных напрамках: жывапіс, арт-аб'екты з металу, дэкаратыўна-прыкладное і тэкстыльнае мастацтва. «Агульная ідэя мастакоў — адлюстраванне ўнутранага свету чалавека, яго пошукаў, значэнняў. Праз творы паказаць магчымасці чалавека і розніцу быцця. Звярнуць увагу людзей на ўнутраныя працэсы, якія даюць рост і рашэнне ўсіх жыццёвых пытанняў. Мастацтва становіцца не мэтай, а сродкам на шляху да самапазнання, самаўдасканалення», — цытуе БелТА словы куратара выстаўкі Людмілы Рыбаковай. Падчас дзеяння праекта будуць праводзіцца майстар-класы, тэматыка якіх — магчымасці развіцця творчага патэнцыялу чалавека.

Рэжысёр Дзмітрый Астрахан паставіць спектакль у Мінску, гаворыцца на сайце «*sb.by*». Творца будзе супрацоўнічаць з трупай Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. «Матэрыял пакуль зацвярджаецца, прэм'ера запланавана на будучы год, — расказаў пастаноўшчык. — Я б хацеў зрабіць гісторыю пра тое, што каханне можа пераадолець усе супярэчнасці, у тым ліку і матэрыяльнага, сацыяльнага характару. Мне здаецца, гэтая тэма сёння як ніколі актуальная». Дарэчы, рэжысёр ужо ставіў у беларускай сталіцы спектаклі «Ледзі на дзень» і «Чацвёртая планета». «Дзмітрый Астрахан валодае неверагоднай энергіяй, амаль дэманічнай, здольны захапіць акцёраў любой ідэяй. Не стану хаваць, што яго імя ў афішы любога тэатра сёння — гэта гарантаваны камерцыйны поспех», — адзначыў мастацкі кіраўнік тэатра рэжысёр Сяргей Кавальчык.

Расійскі піяніст і кампазітар Кірыл Рыхтэр выступіць на сцэне Палаца рэспублікі ў суправаджэнні *Richter Trio* і сімфанічнага аркестра. 19 лістапада яны прадставяць увазе мінскіх аматараў музыкі творы, напісаныя спецыяльна для балетаў у пастаноўцы Сяргея Палуніна — «Распуціна», «Боскай камедыі» і іншых. У дапаўненне да асноўнай праграмы вечара Кірыл Рыхтэр выканае галоўныя сачыненні і кампазіцыі з альбома *CHRONOS*, інфармуе БелТА. «Мая музыка — саўндтрэк да майго жыцця, да момантаў, якія здараліся са мной, — адзначае творца. — Гісторыі, якія я распавядаю, нейкім чынам знаходзяць водгук і ў іншых жыццях. Менавіта тады нараджаецца пачуццё, быццам мы ўсе гаворым на адной мове».

У праграму 78-га Венецыянскага кінафестывалю ўвайшоў дакументальны фільм пра кампазітара Эніа Марыконе, паведамляе РІА «Новости». Стужку рэжысёра Джузэпэ Тарнаторэ пад назвай «Эніа» пакажуць па-за конкурсам. У карціне сабраны архіўныя запісы, каментарыі такіх кампазітараў і рэжысёраў, як Бернарда Берталучы, Дарыа Арджэнта, Олівер Стоўн, Квенцін Таранціна, Ханс Цымер, і многіх іншых. У фільм таксама ўвайшло інтэрв'ю Тарнаторэ са славутым кампазітарам. «Я працаваў з Эніа Марыконе трыццаць гадоў. Здымаў з ім амаль усе свае фільмы, не кажучы ўжо пра дакументальныя стужкі, рэкламныя ролікі і праекты, якія мы беспаспяхова спрабавалі зрабіць. За гэты час наша сяброўства мацнела. Карціна за карцінай, па меры таго, як я лепш разумеў Эніа як чалавека і мастака, мне станавілася ўсё цікавей, які дакументальны фільм я мог бы зняць пра яго. І сёння мая мара спраўдзілася», — расказаў рэжысёр.

**Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

# Канкурэнт Багдановіча — Альфонс Петрашкевіч

**На пытанне «Як становяцца класікамі літаратуры?» адказ, хутчэй за ўсё, будзе прадказальны: «Дзякуючы сваім творам». Цалкам слушна, нельга не пагадзіцца. Пры гэтым многія не задумваюцца, што за сённяшнім агульнанародным прызнаннем, хрэстаматыйнасцю мастацкай спадчыны стаяць у мінулым рэальныя, незаўважныя старонняму воку асобасныя механізмы падтрымкі, папулярызацыі, урэшце — культывавання творчасці таго ці іншага аўтара.**

## Новы час — новыя героі

Храналагічны прамежак з 1917 да 1920 года адметны для Беларусі рэальнымі крокамі на шляху дзяржаўнага будаўніцтва. На такі гістарычны шанец у нашаніўскі, культурна-асветніцкі перыяд, не было практычна ніякіх спадзяванняў і планаў. Сцішанае вайной літаратурнае жыццё саступіла месца росквіту публіцыстыкі, прысвечанай бурным абмеркаванням лёсу народа на зломах гісторыі. Статус цэнтра беларускага культурнага і палітычнага жыцця спакваля пераходзіць ад Вільні да Мінска.

На парадку дня ў гэты час паўставала неабходнасць стварэння пантэона нацыянальных герояў. Першая сусветная вайна, рэвалюцыйныя хваляванні, грамадзянскае супрацьстаянне спарадзілі незлічоную колькасць трагічных ахвяр. Невылечныя на той час хваробы бралі сваю даніну.

Увага архітэктараў нацыятворчасці факусіравалася на нядаўніх стратах у падзвіжніцкай працы, асабліва — у мастацкай літаратуры. Выпрацоўваўся своеасаблівы «жыццёвы канон» новага часу, якому ўжо не адпавядала шляхецкае паходжанне большасці беларускіх пісьменнікаў XIX — пачатку XX стагоддзяў. На першае месца, яшчэ задоўга да паўнамаштабнага ўсталявання бальшавіцкай ідэалогіі, выходзіў сялянскі (радзей — пралетарскі, разначынскі) радавод. Запатрабаванымі аспектамі біяграфіі прэтэндэнта на залічэнне ў нацыянальны пантэон сталі акалічнасці, якія традыцыйна ўпісваліся ў каардынаты асаблівай людской увагі і спагады, — сіроцтва, цяжкая праца, невылечная хвароба, ранняя смерць.

Альфонс Петрашкевіч і Максім Багдановіч падобны не толькі сваімі лёсамі і творчасцю. Заўчасны адыход абодвух аўтараў напярэдадні рэзкіх сацыяльных размежаванняў і супрацьстаянняў прадвызначыў іх палітычную неангажаванасць. Пры гэтым ад самага пачатку А. Петрашкевіч меў некаторыя значныя перавагі перад «паэтам з берагоў Волгі». Выхадзец з ваколіц Крайска, што ў цяперашнім Лагойскім раёне Мінскай вобласці, у вачах грамадскасці быў сваім, мясцовым самародкам, заўважаным і выхаваным у нацыянальным духу дзякуючы маральнай падтрымцы беларускіх інтэлектуальных лідараў.

Творчыя памкненні таленавітага паэта звярнулі на сябе ўвагу сучаснікаў. Вельмі яскрава пра гэта сведчыць верш Андрэя Зязюлі «Альфонсу Петрашкевічу», змешчаны ў газеце «Беларус», што выдавалася ў Вільні лацінскім шрыфтам, ад 17 ліпеня 1915 года. Эпістала вытрымана ў нашаніўскім духу культывавання фальклорных вобразна-выяўленчых сродкаў. Пажаданне аўтара, адрасаванае «Гуслярочку», — зайграць «…дзіўныя песні // Аб шчаслівай долі, // Да якой мы на прадвесні // Рвёмся з пут няволі». Выказана аптымістычнае спадзяванне, што «Леты гора перакліча, // Шчасця пажадае, // Да работы ўсіх пакліча // Думка маладая».

На асобе Альфонса Петрашкевіча пасля вечнага спачыну сканцэнтравалася беспрэцэдэнтная ўвага нацыянальнай перыёдыкі. Публікаваліся не толькі яго кароткія жыццяпісы, хваласпеўныя



*Фота з часопіса «Рунь», 1920 г., №1.*

*Альфонс Петрашкевіч.*

характарыстыкі творчасці, але і невядомыя вершы, урэшце — фотапартрэт, рэдкая па тым часе падзея, не дазнаная сучаснымі даследчыкамі.

Калі звярнуцца да фондаў вядучых кніга- і архівасховішчаў Беларусі, супаставіць матэрыялы акадэмічных, даведачных, а таксама рарытэтных выданняў, то можна заўважыць досыць парадаксальную сітуацыю: на многія дзесяцігоддзі з фокусу ўвагі даследчыкаў поўнасцю выпала нацыянальная перыёдыка некаторых мінулых гадоў. А менавіта зварот да надрукаванага слова дае сёння рэальныя магчымасці запаўнення гістарыяграфічных лакун беларускай літаратуры.

Для спецыялістаў архіўнай справы вядома такое паняцце як *затуханне* тэкстаў, што маюць дрэнную аснову і слабую графіку. У сітуацыі з аб'ектам нашай увагі гэтае вызначэнне можна пашырыць на розныя крыніцы інфармацыі.

## Падрыхтоўчыя накіды

У «Анталогіі беларускай паэзіі» (1961, т. 1) пра А. Петрашкевіча (Ф. Калінку) усяго некалькі радкоў: «…вясковы паэт-самавук. Нарадзіўся ў 1894 г. і памёр у 1918. Больш дакладных біяграфічных звестак няма. Друкаваўся на старонках "Нашай Нівы"». Творчасць праілюстравана трыма вершамі: «Не смейся», «Песня» («Ой, пайшоў бы ў свет далёкі…»), «Песня» («Не хадзі на горку…»).

Не нашмат пабагацела інфармацыя ў першым томе «Анталогіі…» за 1993 год. Дадаўся яшчэ адзін псеўданім (Пранцішак Красоўскі), пералік выданняў, з якімі супрацоўнічаў паэт, а таксама дробныя штрыхі да абмалёўкі творчасці: «З 1911 г. друкаваў лірычныя і гумарыстычныя вершы…»; «распрацоўваў класічныя паэтычныя формы». Ілюстратыўная вершаваная траістасць вытрымана і ў гэтым выданні: «Не смейся…», «***Скачы, браце, ў роднай хаце», «***Хацеў бы ветру быць я братам».

Куды больш разгорнутыя звесткі пра жыццё і творчасць Альфонса Петрашкевіча прадстаўлены ў біябібліяграфічным слоўніку «Беларускія пісьменнікі» (1995, т. 5). Постаць паэта пачала набываць больш-менш канкрэтныя абрысы, хаця і ў гэтым, і ў названых вышэй выданнях адсутнічае яго фатаграфічная выява. Названа дата і месца спачыну — 20 мая 1918 года, фальварак Вінцантова Вілейскага павета Віленскай губерні; прыведзена новая фактаграфія: шляхецкае паходжанне, ранняе сіроцтва, выхаванне ў дзядзькі-селяніна, атрыманне пачатковай адукацыі, праца на зямлі і інш. У ранніх вершах, напісаных на рускай і польскай мовах, А. Петрашкевіч высмейваў норавы засцянковай шляхты. Прыкладна ў 1909 годзе пад уплывам Змітрака Бядулі паэт трывала стаў на беларускі літаратурны шлях. «Услед за М. Багдановічам, — адзначана ў даведніку, — А. Петрашкевіч паспяхова культываваў такія паэтычныя формы, як трыялет, раманс, элегія…» На жаль, засталіся ў рукапісах, лёс якіх невядомы, «каля ста вершаў, некалькі невялікіх ліра-паэм…»

## Архіўныя зацемкі

Мінская газета «Беларускі шлях» ад 28 мая 1918 г. паведамляла на сваёй першай старонцы сярод галоўных навін: «Прыйшла да нас сумная вестка, што 20 г.<этага> м.<есяца> скончыўся ў засценку Вінцэнтава, Крайскай вол.<асці> Вілейскага павету ад запалення плуцу наш малады пясняр А. Петрашкевіч (Ф. Калінка)».

Як можам пераканацца, назва роднай мясціны сучаснікамі паэта фіксавалася ў трохі адрозным варыянце: *фальварак Вінцантова / засценак Вінцэнтава*. Указанне дакладнай прычыны смерці («запаленне *плуцу*») гаворыць аб блізкім знаёмстве аўтара допісу з нядаўна спачылым, а назва хваробы (пакуль не высветленай) мае відавочны рэгіянальны характар.

Перад намі не проста некралог, а ўзнёслая характарыстыка творчасці: «Паэзія яго — шчырая, простая, пісаная мазольнаю рукою маладога селяніна-хлебароба. Гэта — скромны салоўка беларускіх зялёных далін, кволага бярэзніка ля рэчкі. Вішнёвы сад, зялёны дубок, язмін, жаўронак, думкі ратая, бытавыя абразкі засцянковай шляхты — матывы яго паэзіі».

Некалькімі сказамі акрэслены цяга да ведаў, уласная асветніцкая дзейнасць спачылага: «Калінка, кончыўшы толькі народную школу, рваўся да навукі ў горад, але варункі жыцця беднага ратая рэдка каму гэта пазваляюць»; «…на ўсёй сваёй ваколіцы шырыў беларускае друкаванае слова і беларускую ідэю». У газеце «Беларускі шлях» ці не ўпершыню ў гісторыі, яшчэ задоўга да стварэння першых нацыянальных літаратурна-мастацкіх аб'яднанняў, словы спачування выказаны ад майстроў пяра як асобнай творчай карпарацыі: «Рэдакцыя ад імяні ўсіх беларускіх пісьменнікаў выказвае свой шчыры сум-жаль бацькам і сваякам без пары спачыўшага навекі маладога паэта».

Газета «Вольная Беларусь» (Мінск) ад 9 чэрвеня 1918 года адвяла асноўную выдавецкую плошчу сваёй перадавіцы пад артыкул «Дзве страты»: «Вось ужо другі год, як вясна адбірае ў нас нашых лепшых людзей. Летась у весну, 26 (12) мая, пайшоў да Бога свечкаю М. Багдановіч, а сяголета ў адзін дзень, 20-га мая, памерлі двое: К. Каганец і новы пясняр, малады вясковы хлопец Ф. Калінка (А. Петрашкевіч)».

Даруем невядомаму журналісту памылку ў даце спачыну аўтара «Вянка» (на самай справе — 25 мая), прапусцім напісанае ім пра жыццёвы і творчы шлях Каруся Каганца, вылучым толькі некаторыя характарыстыкі творчасці Альфонса Петрашкевіча: «У яго песнях адбіваюцца ціхія, задуменныя беларускія пейзажы, простыя думкі селяніна-хлебароба, каторы рысуе быт свайго жыцця. Яго сумная і падчас гумарыстычная паэзія паказвае нам у простых, ніштучных формах шчырасць душы, парыванні да чагось лепшага, светлага і святочнага».

Мінскі часопіс «Варта» (1918, №1, кастрычнік) змясціў на сваіх старонках два невялікія нарысы, падпісаныя крыптанімам *С. П.*, — «Карусь Каганец (Кастравіцкі)» і «Альфонс Петрашкевіч (Ф. Калінка)». На жаль, з тэкстамі гэтых публікацый нам пакуль што не ўдалося азнаёміцца. Адзіны экзэмпляр «Варты», які захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі (электронная копія даступна ў інтэрнэце), не поўны, патрэбныя старонкі адсутнічаюць. Параўноўваючы тэксты папярэдніх публікацый, напрошваецца гіпотэза, што іх аўтар — адзін чалавек, а за крыптанімам *С. П.* стаіць Самуіл Плаўнік (пісьменнік Змітрок Бядуля).

Уцалелыя старонкі часопіса дораць яшчэ адну знаходку — «Многа зорак…» Ф. Калінкі з падзагалоўкам «Пасмертны верш», пазнакамі часу і месца стварэння: 1915 год, засценак Вінцэнтава.

*Многа зорак ў небе ясных*
*Не злічыць ніколі,*
*Мала дзён у жыцці шчасных —*
*Нешчаслівых болей.*
*Пагляджу на зоркі ў ночы*
*Радасць там і воля…*
*І заплачуць слязьмі вочы*
*Ад нуды ды болю.*
*І так труднінька жыць стане,*
*Хоць завый з ваўкамі…*
*Ах, ці скора доля з'яне,*
*Запануе з намі!..*

## Завершанасць партрэта

Першы нумар часопіса «Рунь» (поўная назва — «Рунь беларускае літаратуры і мастацтва») ад 2 мая 1920 года — гэта творчы маніфест выдання. У ім змешчаны своеасаблівы праграмны дыптых: верш Янкі Купалы «У вырай!» і эсэ Змітрака Бядулі «Рунь». Менавіта ў гэтым выпуску на сёмай старонцы змешчаны матэрыялы, прысвечаныя другім (!) угодкам з дня смерці А. Петрашкевіча (Ф. Калінкі).

Паўстае завершанае біяграфічна-творчае трыадзінства. Перад намі вялікі партрэт паэта, з якога глядзіць дапытлівы юнак з кнігай у левай руцэ. (Можна з вялікай верагоднасцю сцвярджаць, што ў распараджэнні выдаўцоў быў арыгінал здымка.) Невялікі тэкст з характарыстыкай жыцця і творчасці А. Петрашкевіча ўяўляе сабой сціслы пераказ памятных публікацый 1918 года. Верш «Перасцярога (Беларускім дзеткам)» — своеасаблівы запавет заўчасна спачылага паэта:

*Дзеткі, дзеткі, не глумеце*
*Гэтых кветак-васількоў,*
*Без патрэбы іх не рвеце*
*І не керзайце вянкоў.*

*І не кідайце на шляху,*
*Падарожны каб таптаў,*
*Каб бязсільных і бяз паху*
*Вецер з пылам разам гнаў.*

*І не кідайце, каб сонца*
*Іх сушыла, іх пякло,*
*Лепш нясіце на ваконца,*
*Дзе спакойна і — святло…*

*Хай памруць яны ў спакою,*
*Не стаптаныя нікім,*
*І пабляклшаю красою*
*Хай напомняць прышласць ўсім.*

У «Гісторыі беларускай літаратуры» (Вільня, 1920), падрыхтаванай Максімам Гарэцкім, сціслыя звесткі пра Альфонса Петрашкевіча ў парытэтным тэкставым аб'ёме змешчаны на адной старонцы з інфармацыяй пра Антона Навіну, Сяргея Палуяна, Старога Уласа і інш. Ігнат Дварчанін апублікаваў у «Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры (ад 1905 году)» (Вільня, 1927) два вершы паэта — «Перасцярога» і «***Скачы, браце, ў роднай хаце…» На гэтым, па сутнасці, і спынілася ўваходжанне Філафея Калінкі ў гісторыю нацыянальнага пісьменства.

Спадчына аўтараў, згаданых М. Гарэцкім побач з А. Петрашкевічам, была сабрана і вернута да чытача ў 1990-х гадах. Думаецца, выданне кнігі творчага пабраціма М. Багдановіча значна ўзбагаціла б наша бачанне літаратурнага працэсу перыяду фарміравання нацыянальнай класікі.

**Мікола ТРУС,**
**кандыдат філалагічных навук**

# Этымалагічныя эцюды*

## З кнігі «След самаеда»

### Капыль

У саамскіх гаворках крыніца яшчэ атэстоўваецца словам *копь*. Разглядаючы карту айчынных тапонімаў, найперш адшукваем яго ў найменні ‘Капыль’. Яно, гэтае найменне, паходзіць не ад ‘капыла’, шавецкай калодкі ці капалкі-матыкі, і не ад натурыстай асобы, што ‘капыліць губы’, і нават не ад паганскага ‘капішча’, а ад яе, саамскай крыніцы *копь*, ёй і вытлумачваецца.

Першая згадка пра Капыль (‘Копыль’) сустракаецца ў Галіцка-Валынскім летапісе за 1274 год, калі князь Мсціслаў ‘шелъ бяшеть от Копыля’, археолагі па выяўленых артэфактах мяркуюць, што ён быў ужо заселены ў XI стагоддзі дрыгавічамі. Аднак сам тапонім вядзе яшчэ ў даўнейшую даўніну, у прадгісторыю.

Гістарычным і тапаграфічным цэнтрам Капыля з’яўляецца ‘Капыльскае замчышча’, ці ‘Замкавая гара’ — узвышша, што месціцца каля сутоку рэчак Мажы і Каменкі, утворана ледавіком і датворана людзьмі. У замчышча, у сваю чаргу, ёсць першаісны цэнтр, свой ‘вечны агонь’, што не згасае тысячагоддзі, — крыніца, *копь* па-саамску. Вось яна, крыніца на ўзвышшы, і сталася асновай апелятыва ‘капыль’. *Копь* — першы кампанент словаформы, другі — *ылл*, у значэнні ‘высокі’. *Копь ылл* — ‘крыніца, што высока’: так вытлумачвае сябе тапонім. Слову ‘высокі’ яшчэ адпавядае саамскае *эл*л (найменне, у арфаграфіі якога яно прысутнічае, мае форму ‘Копел’, яго можна напаткаць у пісцовых кнігах), а таксама *алл*. У іх, гэтых лексемах, тая самая семантыка, аднак апроч свайго наўпроставага значэння яны яшчэ могуць мець (і, пэўна, маюць) значэнне, адпаведнае таму, што змяшчаецца ў словах *ял* (а гэта ‘жыццё’), *еллей* (‘жыхар, жыхары’), *елле* (‘жыць’) саамскай мовы, *иле(сь)* (‘жыць’), *иле* (‘жылы’) ненэцкай мовы. Апынаючыся фармантамі ў словаформе наймення, яны азначаюць жытлішча, жыллё, жыхарства, і ‘Капыль’ у такім разе чытаецца як жытлішча ці жыхарства каля крыніцы. Магчыма, недзе некалі ‘высокае’ і ‘жыццёвае’ не распадабняліся, і мова самаедаў захоўвае згадкі-здагадкі пра гэтае нераспадабненне.

Абедзве лексемы (‘крынічная’ і ‘жыццёва-высокая’) сваёй фонасемантыкай прысутнічаюць у беларускіх, і не адно ў беларускіх, тапонімах Капылы, Капілы, Каплі, Копаль, Капылова, Капылоўка, Капылок, Капілоўшчына, Капыльшчына, Копылка, Кабылі́нае, а паасобку (адна першая і адна другая) — у шмат якіх іншых.

Фота з сайта planetabelarus.by.

Замчышча ў Капылі.

### Лякацца, лекавацца

На беларускай мове *лякаць* — палохаць, пужаць, *лякацца* — палохацца, пужацца; на ўкраінскай *лякати(ся)*, на польскай *lękać się*, на чэшскай *lekati (se)*, на славацкай *ľakať (sa)*.

Этымолагі суадносяць гэтае слова з літоўскім *lenkti* і латышскім *liekt* (‘згінаць, нахіляць, гнуць’) і лічаць, што першаснае значэнне *лякаць* і *лякацца* ‘згінацца ад жаху’. Аднак у гэтай гіпотэзы штучная канструкцыя, і ‘жах’ у ёй не прысутнічае. Ён прысутнічае ў іншым слове, у самадзійскім, з якога яны і выніклі, у *ңылека*, што на ненэцкай мове азначае ‘злосная страхатлівая звышнатуральная істота, якая выклікае хваробы’, таясамная чорту. Яна лякала, яе лякаліся і *лекаваліся* (!) таксама ад яе. Той, хто ўмеў гэта рабіць, быў *лекарам*, сродкі, якія ён пры гэтым карыстаў, былі *лекамі*.

### Белае

Белае: азёраў з такім найменнем у Беларусі шмат (гэта возера ў Бярозаўскім раёне, у Брэсцкім, у Драгічынскім, у Лунінецкім, у Астравецкім, у Гродзенскім, у Жыткавіцкім, у Браслаўскім, у Бешанковіцкім, у Гарадоцкім, у Глыбоцкім, у Верхнядзвінскім, у Міёрскім, у Полацкім, у Пастаўскім, у Расонскім, ва Ушацкім, у Чашніцкім, у Шумілінскім, а ў некаторых раёнах па некалькі). Ёсць яны і ва Украіне, і ў іншых краях, і ці не найбольш у Расіі. Тое самае тычыцца ракі Белай.

Бельск, Белае, Бельскае, Бяларучы, Бялынічы, Бялавіна, Беліца, Бельчыца, Бельчыцы, Бялавічы, Белькі, Бель, Бельцы, Беляны, Беляі, Бялюнішкі, Белянішкі, Белічы, Белева, Бяляўшчына, Белінск, Бялымшчына, Белькішкі, а таксама Падбелле, Падбела, Забеліна, Забелле — шматлікія айконімы, што маюць у сваім найменні аснову *бел*, так ці гэтак прывязаныя да ракі ці да возера. Горад Беласток, што ў Польшчы, займеў сваё найменне ад ракі Бялай, на якой месціцца. Гэтаксама другі Беласток, што на Валыні, узяў найменне ад рэчкі, на якой месціцца, аднак сама рэчка называецца Чарнагузкай. І Беластокам называецца рэчка, што цячэ ва Львоўскай вобласці.

Што такое ‘белае’? Адкуль яно вынікла, атаясаміўшыся са славянскім найменнем колеру? У ‘светлых’ рыбін, пра якія мы згадвалі, свой водны сегмент, і нельма, ці, інакш, беларыбіца, а на ненэцкай *сявта*, пакмеціла сваім найменнем ‘святыя’ азёры і рэкі, у ‘белых’ тапонімаў мае быць іншае паходжанне, якое?

У таўгійскім (нганасанскім) слоўніку Мацiяса Аляксандра Кастрэна значыцца слова, якое вытлумачвае паходжанне ‘белых’ тапонімаў: гэта *belea* (на нямецкай ‘wasserreich’, адпаведна на беларускай ‘багаты на ваду, паўнаводны’), дзе *be* — вада. Ды яшчэ ўтворанае ад слова *kole* (‘рыба’) *kolebeala* ‘рыбны’, дзе дзякуючы фарманту *beala* назоўнік ператвараецца ў прыметнік. У «Марфалагічным слоўніку энецкай мовы» Тыбара Мікалы ‘wasserreich (wässerig)’ *billego*. Возера Белае, рака Белая — найперш атэстацыя і маркіроўка, якая гэта рака і якое возера.

Фота БелТА.

Белае возера ў Брэсцкім раёне.

Самым вызначальным у гэтай маркіроўцы аказвалася тое, што яны ‘багатыя на рыбу’. Тое, што яны ‘багатыя на ваду’, разумелася як бы само па сабе: багатыя на рыбу — багатыя на ваду.

Зважайма на гэтае слова: яно можа нешта сказаць і пра само найменне ‘Беларусь’.

### Чорнае

Дзе ёсць возера Белае, там, калі не заўсёды, дык даволі паслядоўна, аб’яўляецца і возера Чорнае. Падышоўшы да аднаго і другога возера і загадзя не ведаючы, каторае з іх якое, не ўгадаеш, дзе Белае, а дзе Чорнае: нічым — ні колерам, ні рэльефам — яны між сабой не адрозніваюцца.

Як дзень і ноч, як плюс і мінус, яны існуюць і хочуць існаваць напару, яны ўзаемасуадносяцца і ўяўляюць складнікі той бінарнай структуры, на якую, маркіруючыся, абапіраецца прастора: дзе ёсць белае, там мае быць чорнае, дзе верх, там ніз.

Так, Аўкштайція (па-літоўску *Aukštaitija* — Верхняя Зямля) вылучылася і займела сваё найменне таму, што ўжо была Жамайція (*Žemaitija* — Ніжняя Зямля), хоць першасны змест тапоніма *Жамайція* іншы, ён застаецца, захоўваючыся, у фонасемантыцы тапоніма *Samogitia*, і ў ім след самаеда.

Дык што такое возера Чорнае? Які змест паклаўся ў структуру яго наймення? Перабіраючы ўсе магчымыя даступныя варыянты, спынімся на тым, на чым ужо спыняліся, — на шчупаку. У ненэцкай мове ў яго два найменні: *пыря* (яго ўжо мы закраналі) і *сяторэй* (у даслоўным перакладзе, пэўна, *куслівы*), апелятыў якога і стаўся падставай, каб возера займела такую назву. Шчупак-*сяторэй* заплыў і ў такія гідронімы, як рэчка Старая, што ў Лідскім раёне, і рачулка Старая, што ў Свіслацкім раёне, рэчка Старая Ухлясць, што ў Быхаўскім раёне, ды Старое возера, што ў Чачэрскім, возера Старуха, што ў Нараўлянскім, і возера Старуха, што ў Петрыкаўскім раёне, возера Старык, што ў Петрыкаўскім, і возера Старык, што ў Быхаўскім раёне, рэчка Старышоўка, што ў Камянецкім раёне, — у гідронімы, што прыўлашчыліся фонасемантыкай слова ‘стары’.

### Вабіць

На беларускай мове *вабіць*, на рускай *вабить*, на ўкраінскай *вабити*, на польскай *wabić*, на верхнялужыцкай *wabić*, на ніжнялужыцкай *wabiś*, на чэшскай *vábiti*, на славацкай *vábiť*, на славенскай *vabiti*, на стараславянскай *вабити*.

У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» гаворыцца, што гэта, па-першае, «захапляючы, зачароўваючы сваім выглядам, прыцягваць да сябе», па-другое, «падзываць птушак або звяроў, падрабляючы іх голас». Вытлумачваючы паходжанне слова, этымолагі таксама высноўваюць два гледжанні: адны выводзяць яго ад ‘голасу’ і суадносяць са стараісландскім *óera* і з гоцкім *wopjan* ‘лемантаваць, крычаць’, другія даводзяць, што напачатку яно было звязана з назвай паляўнічай прылады і мела значэнне ‘заваблівацъ птушку ў пастку’ і прыводзяць прыклады са стараіндыйскай, старагрэцкай, лацінскай, сярэдняверхнянямецкай ды стараанглійскай моў, што маюць дачыненне да слова ‘звязваць’ (гл. «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы»), аднак гэтыя паралелі прыблізныя.

Слова ‘вабіць’ прыйшло не здалёк і не зблізку, а ўзышло з самадзійскага лексікону, асноўнае значэнне яго ‘клікаць, падаваць голас, прынаджваць голасам’. У яго аснове лексема *вабц*: на ненэцкай мове гэта ‘гукі мовы, вымаўленне, голас’. Кожны мае свой голас, але каб вабіць, каб стацца вабным, ён меўся быць адмысловым, своеасаблівым, чароўным. Так, на сялькупскай мове ён і называецца *чары*. Сваім голасам майстры прынаджвалі звяроў і дзікіх птушак, потым як дадатак да голасу вынайдзецца свісток — ‘вабіла’ і ‘вабік’.

### Тэлеханы

Каля глыбокага вадаёма (на ненэцкай *тэл*) месцяцца Тэлеханы — мястэчка, у якім, паводле падання, «пахавана цела хана». Але хан тут ні пры чым, гэта проста ўсё той жа назоўнік *тэл*, але не ў назоўным, а ў месна-творным склоне, і ў гэтым склоне ён набывае суфікс *-хана*, што ў дадзеным выпадку азначае месцазнаходжанне і перакладаецца прыназоўнікам *у* ці *на* (да прыкладу, *тохона* — ‘у (на) возеры’, *яхана* — ‘у (на) рацэ’). Магчыма, у далёкія дагістарычныя часы, калі тут з’явіліся людзі, *тэл* займаў куды большую тэрыторыю, і людзі сяліліся на выспах. Ці нават у самім вадаёме, у яго прыбярэжнай палясе, у буданах, пастаўленых на па́лях. Тады *хана* натуральна адпавядала ‘у’, але цяпер, атэстуючы мястэчка, скарыстаемся адно прыназоўнікам ‘на’: Тэлеханы — (мястэчка) на возеры. Чым адрозніваецца *тэл* ад *то* (возера), дык тым, што яшчэ мае дадатковыя значэнні — значэнні схілу, лагчыны і ўпадзіны-катлавіны. Ну і найперш тым, што мае глыбокае дно. Так, паводле цяперашніх замераў, глыбіня Вулькаўскага возера, каля якога ці на якім месцяцца Тэлеханы, дваццаць чатыры з паловай метры. Людзі, што далі яму (і не толькі яму) найменне, не былі выпадковымі ў гэтым краі, яны асвойвалі рэчаіснасць глыбока і ўсебакова і ў тапонімы ўкладалі здабытыя веды.

Там, дзе *тэл* лагчына, паўтвараліся вадаёмы, самадзійскае найменне якіх *тэл’то* (лагчыннае возера); так, яно прысутнічае ў найменні возера Цялятнае, Цялецкае ды Цяльцы, што ў Расонскім раёне, і яму адпаведных у іншых краях і краінах.

**Алесь РАЗАНАЎ**

**Працяг будзе.**

---

* **Працяг. Пачатак у №24, 27, 30.**

# Патрэбна праўда аб вайне

**Аповесць Анатоля Мацвіенкі «Варшава, Константин Константинович!» прысвечана бадай самаму ўшанаванаму і любімаму на нашай зямлі маршалу Перамогі — Канстанціну Ракасоўскаму. З невычэрпнай тэмы, якой з'яўляецца Другая Сусветная вайна, аўтар выбраў для сваёй аповесці некалькі эпізодаў, непасрэдна звязаных з гэтай выдатнай асобай, і найбольш падрабязна разгледзеў адзін з іх — але ж які! Размова ідзе аб падзеях Варшаўскага антыфашысцкага паўстання 1944 года, аб якім дасюль не сціхаюць (і мабыць, ніколі не сціхнуць) спрэчкі...**

Пачынаецца аповесць з надзвычай кранальнага моманту: ураджэнец Варшавы, савецкі маршал Ракасоўскі на назіральным пункце разглядае праз стэрэатрубу родны горад — увесь чорны ад дыму і попелу...

Калі вам здарыцца быць у Варшаве і слухаць там экскурсію польскага гіда, то ён абавязкова распавядзе аб тым, як Вісла цякла не вадой, а крывёю, і пакажа помнік маленькаму паўстанцу — варшаўскаму Гаўрошу... Без слёз слухаць пра гэта — немагчыма. Потым гід абавязкова прыгадае той факт, што Чырвоная Армія на чале з палякам Ракасоўскім стаяла на другім беразе і абыякава назірала, як гінула безліч варшавянаў...

Але ён (ці яна) не распавядзе вам пра тое, што прычынай той трагедыі быў не маршал і не байцы Чырвонай Арміі, ушчэнт змучаныя папярэднімі цяжкімі баямі (іх яшчэ загіне ажно 600 тысяч, каб вызваліць польскую зямлю ад фашысцкай навалы!). Сапраўдныя абставіны таго найцяжэйшага эпізода добра вядомы навукоўцам, але ж праўдзівая інфармацыя не пасуе шматлікім палітыкам... і, вядома ж, такім вось гідам, якія «апрацоўваюць» даверлівых турыстаў...

Кожнаму хоць крыху зацікаўленаму ў гісторыі Другой Сусветнай вайны, добра вядомыя прычыны таго, чаму жыхары Варшавы паўсталі (практычна з голымі рукамі) супраць узброеных да зубоў фашыстаў ці наогул зрабіліся ахвярамі без аніякай карысці і сэнсу. Адказны за гэта быў польскі «ўрад у выгнанні», які сядзеў у Лондане. Якую ж ролю адыгрываў 1 Беларускі фронт і ягоны камандуючы маршал Ракасоўскі ў той варшаўскай трагедыі?

Мацвіенка бліскуча валодае гістарычным матэрыялам. Нават спецыфічным: гэта планы вайсковых аперацый, дыспазіцыі, віды зброі, прыёмы, скарыстаныя падчас ваенных дзеянняў і г. д.

Так, вызвалення Варшавы прагнулі, здаецца, усе, але недавер да братоў па зброі дасягаў абсурду. Вось «генерал Бур» (Камароўскі), камандуючы паўстанцамі, мэтанакіравана «не бачыў» Ракасоўскага на другім беразе ракі, а зносіны з Масквой ажыццяўляў праз Лондан... Як тое магчыма — рабіць сумесную справу, калі не мець надзейнай і хуткай сувязі? Аўтар прыводзіць

*Фота з сайта stat.mil.ru.*

неверагодныя, але рэальныя факты, напрыклад: калі маршал даслаў сваіх парашутыстаў з рацыяй і кодамі сувязі да Камароўскага — той нават адмовіўся прыняць іх. Пра лёс тых сувязістаў гісторыя маўчыць... Такія невытлумачальныя паводзіны генерала насамрэч зразумець няцяжка. Рэч у тым, што рускіх у Польшчы ненавідзелі. «Сапсаваны тэлефон» Варшава — Лондан — Масква — штаб Ракасоўскага не толькі не дапамагаў справе, але... Няўжо мела месца нават злачынная мана?

У главе «Волоколамское шоссе» чытаем, як жудасна і безвынікова загінулі тры нашыя дэвізіі. І тут міжволі згадваеш суворaўскае «воевать не числом, а умением», чым валодаў мала хто са знакамітых палкаводцаў. Ракасоўскі валодаў. Ён разумеў: патрабаванні атакаваць і наступаць, нават супраць здаровага сэнсу, лёгка «здзяйсняць» толькі седзячы ў цёплым кабінеце...

Польшча, як вядома, была нарэшце вызвалена ад фашыстаў 1-м Беларускім фронтам — ужо з галоўнакамандуючым Жукавым. Але ж якую цану давялося заплаціць за тое! І абавязак тых, хто жыве зараз, хаця б помніць аб гэтым...

Шмат мусяць даведацца з аповесці Мацвіенкі аматары ваеннай гісторыі. Аўтар здолеў выкласці факты такім чынам, што рэальныя падзеі выглядаюць не менш захапляльнымі за які-небудзь адмысловы дэтэктыў. Так, жыццё і ёсць найлепшы пісьменнік — толькі патрэбна ўмець яго аналізаваць, як гэта робіць Анатоль Мацвіенка...

Некаторыя главы аповесці будуць асабліва цікавыя чытачам, якія захапляюцца найперш чалавечымі характарамі і лёсамі. Асобы, якія прадстаўлены ў аповесці, зусім розныя: жонка маршала, дачка, ваенная сяброўка, сястра, польскі калега-генерал, нават нямецкі фельдмаршал. Аўтар не мае мэты ацэньваць альбо асуджаць нікога з іх — ён разумее кожнага. Нават фон Бока — у пэўным сэнсе, вядома. «Небарака» фельдмаршал пакутуе з нагоды самаўпэўненасці і абмежаванасці сваіх камандуючых: менавіта з-за іх не выпадае ўзяць Маскву так хутка, як хацелася... Разам з аўтарам мы адчуваем да яго «спагаду наадварот». І цешыць тое, што, як высвятляецца, гэткімі дрэннымі якасцямі вызначаліся і нямецкія камандзіры...

У аповесці вайна і прыватнае жыццё ідуць побач — як гэта бывае і ў сапраўднасці. Прыўкрасныя жанчыны, якія кахаюць і любяць «галоўнага чалавека» свайго лёсу. Усе яны заслугоўваюць пашаны, і кожную з іх можна зразумець.

У цэнтры аповесці асоба самога Ракасоўскага. Азначаны асноўныя этапы ягонага жыцця: ад рабочай маладосці збяднелага шляхціца — да міністра абароны Польскай Народнай Рэспублікі. І ў гэтым столькі ўсяго, што хопіць на некалькі жыццяў. «Не зусім паляк, — казаў ён пра сябе. — Маці мая — беларуска, з-пад Баранавічаў». Быў ён хрышчаны ў праваслаўі, што таксама нетыпова нават для «напалову паляка». Гэтае «напалову» і вызначыла шырокасць ягонай натуры, якая была пазбаўлена нацыянальнай абмежаванасці і вузкасці розуму...

Прадзед яго ў войску Наполеона біўся супраць рускіх, а Канстанцін зрабіўся «чырвоным камандзірам»: ён паверыў у тое, што «новы свет», які нараджаўся ў Расіі, нясе ісціну ўсяму чалавецтву. Такім ён і застаўся — Асобай, якая здолела не здрадзіць самой сабе нягледзячы ні на што. Ілжыва абвінавачаны НКУСам, як здолеў ён дараваць сваёй другой Радзіме і працягваць служыць ёй старанна і сумленна? Нават тады, калі быў прыніжаны: некаму іншаму даручылі вызваляць родны горад, а потым і ўзяць Берлін — таму што яго лічылі чужынцам... Каб быць здатным на такое, трэба мець нейкую іншую, вышэйшую свядомасць...

Ён і быў іншым, не такім як усе! Заставаўся інтэлігентам з вытанчанымі манерамі сярод мацернага ваеннага жыцця-быцця. Ніколі не крыўдзіў іншых, хаця сам спазнаў крыўды... Напэўна, дзеля такіх людзей і трывае яшчэ Гасподзь чалавецтва...

Аповесць натхняе на вывучэнне гісторыі, бо разумееш: дасведчаны ў ёй чалавек робіцца больш разумным і годным...

* * *

Тое, пра што напісаў Анатоль Мацвіенка, «дела давно минувших дней». Але ж дзіўна: і людзі, і падзеі ў аповесці ўспрымаюцца так, як быццам яны маюць непасрэднае дачыненне да нас, сучаснікаў. Прычынай таму не толькі талент пісьменніка. Рэч у тым, што самому аўтару вельмі цікава і патрэбна тое, аб чым ён распавядае нам. І душа чытача не можа не адгукнуцца. У наш час, калі навалай ідзе перагляд гісторыі, такая літаратура патрэбна як ніколі. Людзі, якія пазбаўлены памяці, робяцца безабароннымі…

**Алена ЧЫЖЭЎСКАЯ**

# Нарысы партызанскага быту

**Кніга «Камандзір» гродзенскай пісьменніцы і публіцыста Ірыны Шатыронак выйшла сёлета ў выдавецтве «Беларусь». Дакументальна-мастацкая аповесць прысвечана невядомым старонкам жыцця партызанскага камандзіра Дзмітрыя Дзенісенкі і яго баявых таварышаў. Новы твор — вынік даследчай працы пісьменніцы апошніх шасці гадоў. За гэты час ваенныя нарысы, якія сталі часткай кнігі, публікаваліся ў многіх айчынных выданнях.**

Твор Ірыны Шатыронак пабудаваны ў выглядзе хронік і нарысаў ваеннага часу. Асноўнае дзеянне аповесці адбываецца на тэрыторыі Навагрудскага і Карэліцкага раёнаў, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў магутны партызанскі рух. Галоўны герой — камандзір 1-й Беларускай кавалерыйскай партызанскай брыгады Дзмітрый Анісімавіч Дзенісенка — прайшоў складаны жыццёвы шлях, а падзеі ваеннага перыяду пакінулі сур'ёзны адбітак на яго лёсе. Кубанскі казак, кадравы ваенны, ён пачынаў вайну ў складзе 6-й кавалерыйскай Кубана-Церскай казацкай дывізіі імя С. М. Будзённага. У чэрвені 1941 года трапіў у палон, у маі 1942-га разам з групай палонных яму ўдалося збегчы і далучыцца да партызанскага атрада, камандзірам якога ён быў пазней прызначаны. Атрад базіраваўся ў Налібоцкай пушчы, вырас да 1-й Беларускай асобнай партызанскай брыгады, правёў вялікую колькасць паспяховых баявых аперацый. У пачатку вайны Дзмітрый Дзенісенка быў сяржантам, а перамогу сустрэў у званні палкоўніка.

У аповесці выкарыстоўваецца перапіска Дзмітрыя Дзенісенкі, а таксама ўспаміны тых, хто ведаў героя, фатаграфіі людзей, якія былі побач з ім. Дапаўняюць тэкст і матэрыялы з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, і сюжэты з навуковых публікацый. Так, прыведзены такія дакументы, як загады камандзіра атрада і справаздачы. У іх ліку — аб прысудах партызанскага суда да расстрэлу за ўчынкі, якія няславілі званне партызана. Не ў апошнюю чаргу ўяўляюць цікавасць гісторыі, у якіх апісаны адносіны з паліцаямі (змешчаны пратаколы допытаў палонных паліцаяў, перапіскі з некаторымі камандзірамі паліцэйскіх гарнізонаў).





Як адзначае аўтар, дзякуючы знойдзеным звесткам адкрыты новыя старонкі ў біяграфіях вядомых у рэспубліцы людзей, звязаных з партызанскім рухам. Архіўныя дакументы дапамаглі Ірыне Шатыронак аб'яднаць адсутныя звёны ў жыццёвых гісторыях беларускіх пісьменнікаў-партызан: Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка, Аляксея Карпюка, Вячаслава Хілімонава і іншых асоб, звязаных з Гродзенскім рэгіёнам.

Дарэчы, эпіграфам да кнігі паслужылі словы ваеннага журналіста Ільі Эрэнбурга: «Вайна складаная, цёмная і густая, як непраходны лес. Яна не падобная на яе апісанні, яна і прасцей, і складаней. Яе адчуваюць, але не заўсёды разумеюць удзельнікі. Яе разумеюць, але не адчуваюць пазнейшыя даследчыкі». Выбраная форма апавядання дазволіла пісьменніцы выказаць асабістыя меркаванні, якія сфарміраваліся ў працэсе работы з матэрыялам. Ірына Шатыронак праз увесь тэкст трансліруе паважлівае стаўленне да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. «Памяці пакалення партызан, якое сышло, прысвячаю» — гэтыя словы вынесены аўтарам у самы пачатак. Аднак, як ужо адзначалася раней, апісаныя падзеі не прадстаўлены выключна ў станоўчым ракурсе.

У аповесці «Камандзір» аўтар паспрабавала паказаць партызанскі быт, баявыя дзеянні партызан, узаемаадносіны з мясцовымі жыхарамі. У тэксце прыводзіцца шмат прозвішчаў і кароткія біяграфіі асоб, якія былі побач з галоўным героем у ваенны час і пасля заканчэння вайны. Натуральна, пераважная іх большасць не вядома чытачу, але гэта дае магчымасць убачыць, што Вялікая Айчынная прайшла скрозь лёсы ўсіх людзей, пакінуўшы глыбокі след.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Прыцяжэнне роднага парога

**Пісьменнік-краязнаўца Аляксей Сазанчук, аўтар адразу дзвюх кніг пад адной назвай «Ах, судьба моя, Корма!», нарадзіўся ў Нараўлянскім раёне: быў малодшым сярод сямі дзяцей. Сталае жыццё Аляксея Іванавіча было звязана са службай у органах унутраных спраў, як на тэрыторыі БССР (прайшоў шлях ад радавога міліцыянера да намесніка начальніка Жлобінскага ГРАУС), так і ў следчых падраздзяленнях УУС Ямала-Нянецкай аўтаномнай акругі Расіі, куды лёс закінуў з сям'ёй пасля трагічных падзей на Чарнобыльскай АЭС.**

У 1996 годзе ў званні падпалкоўніка міліцыі ўраджэнец Палесся выходзіць на пенсію па выслузе гадоў і праз некаторы час вяртаецца ў Беларусь. Жыве на Гродзеншчыне, там стварае шэраг краязнаўча-мастацкіх кніг: пра людзей, якія побач, блізкіх па духу і сумленных, шчырых працаўнікоў, ды і пра зямлю, якую не мог забыць, — родную Нараўляншчыну.

Як кажуць, сэрцу не загадаеш: нарэшце, у 2016 годзе прымае рашэнне вярнуцца ў родныя мясціны — туды, дзе яго карані. І тут ужо, надыхаўшыся родным паветрам, вельмі актыўна працуе як пісьменнік-краязнаўца.

Толькі летась з друку выйшла дакументальная аповесць «Дарога даўжынёю ў жыццё» (пра жыццёвы шлях свайго земляка, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, гамяльчаніна Аляксея Галавацкага: служыў кулямётчыкам у адным са злучэнняў партызанскіх атрадаў, якія змагаліся з фашыстамі пад камандаваннем генерала-маёра Аляксандра Сабурава, у складзе І Беларускага фронту дайшоў да Берліна…), а цяпер у розных выдавецтвах Беларусі Сазанчук як пісьменнік-дакументаліст друкуе адразу дзве паўнавартасныя кнігі, паяднаныя адной назвай «Ах, судьба моя, Корма!». Прысвяціў іх аўтар рэальным падзеям, што адбываліся з рэальнымі людзьмі ў няпростых 80-х гадах мінулага стагоддзя.

Чаму — Карма? Чаму менавіта гэты невялікі раённы цэнтр стаў вызначальным для творцы, які ўзяўся напісаць дакументальна-краязнаўчы твор? Адказ — у біяграфіі Аляксея Іванавіча. Ды і ў самой кнізе.

Пасля вучобы ў Валгаградскай вышэйшай следчай школе МУС СССР, яе выпускнік Аляксей Сазанчук на працягу пяці гадоў служыў следчым, затым старшым следчым Кармянскага РАУС. Карма стала для яго не толькі месцам, дзе атрымаў прафесійнае прызнанне, — у гэтым прыгожым краі ён сустрэў гасцінных, працалюбівых, дбайных і таленавітых людзей, якія шчыра клапаціліся аб сваёй роднай зямлі. Іх лёс, акроплены многімі сумнымі падзеямі — Чарнобылем, развалам СССР, — хваляваў Сазанчука ўсё жыццё. З многімі кармянцамі сябраваў, трымаў сувязь на працягу дзесяцігоддзяў. Безумоўна, да дробязяў памятаў і першыя крымінальныя справы, якія яму, маладому следчаму, даводзілася весці ў пасожскай глыбінцы, з памяці такое ніколі не сатрэш. І калі праз столькі гадоў вярнуўся на роднае Палессе, надта карцела ўзяцца за напісанне кнігі пра яго Кармяншчыну.



*Вокладка II тома кнігі.*

Так, персанажы двух кніг — рэальныя людзі. Кіраўнікі ўладных, праваахоўных структур таго часу. Адданыя зямлі, на якой жылі, любілі і працавалі, якія паважалі і падтрымлівалі аратых і сейбітаў, працаўнікоў сацыяльнай сферы, інтэлігенцыю. Такія, як першы сакратар райкама партыі Міхаіл Ігнаценка, як пракурор Анатоль Лук'янаў, і іншыя. Гэтыя героі мелі ідэалы, сумленне і веру ў справядлівасць. Яны верылі ў сваю краіну і законнасць. Яны заўсёды былі на баку сумленных працаўнікоў.

Аднак аўтар праўдзіва паказвае і тых, хто страціў сумленне, беспрынцыпных кар'ерыстаў, якіх было, зразумела, значна меней, але ж сваімі дзеяннямі яны знішчалі гэтую веру ў справядлівасць. Прыклады двайной маралі, духоўнае перараджэнне і хлусня заганяюць у тупік маладога юрыста, выпускніка вышэйшай следчай школы…

Апісваючы рэальныя падзеі, Сазанчук дае свае ацэнкі таму часу. Ён — прыхільнік сацыялістычнага ўкладу жыцця, бо лічыць, што галоўным у ім былі дабрыня і клопат пра чалавека, мір і стваральная праца, а ўсе недахопы (яны, безумоўна, былі) можна было хутка выправіць…

Аўтар палымяна заклікае нас, жыхароў Беларусі, думаць, берагчы сваю зямлю. У любым выпадку новыя кнігі палескага дакументаліста могуць выклікаць дыскусіі, многія яго разважанні могуць паказацца часам наіўнымі, аднак не пагадзіцца з большасцю высноў цяжка, бо творца мае рацыю: любому злу не павінна быць месца на планеце Зямля!

**Мікалай ІГНАТОВІЧ**

# Гісторыі пра творчых людзей

**Як выклікаць прыхільнасць да сябе рэдактара? Куды рухаецца беларуская мова? Адказы можна знайсці ў кнізе беларускай пісьменніцы Зоі Падліпскай «Сістэма каардынат».**

Кніга Зоі Падліпскай — гэта зборнік інтэрв'ю з выбітнымі людзьмі Беларусі: дзеячамі мастацтва і навукі. Яго галоўная мэта, як піша аўтар у прадмове, — выклікаць у чытача жаданне задумацца над сваім лёсам. Акрамя гэтага, пісьменніца спрабуе адказаць на пытанні «А што такое лёс і ці можна ўплываць на яго, змяняць да лепшага?» Героі распавядаюць аб тым, як складвалася жыццё і што на іх паўплывала. Так кожнае інтэрв'ю пачынаецца з пытання пра дзяцінства. Часта аўтар потым пытаецца пра важныя падзеі ў біяграфіі героя, а таксама якія кнігі сфарміравалі яго. Гэта дазваляе паглядзець па-новаму на ўласны досвед, а таксама на тое, як змяніць сваё жыццё да лепшага.

Зоя Іванаўна часта звяртаецца да лёсу не толькі аднаго чалавека, але і ўсёй краіны, і гэтая кніга не выключэнне. Так, Зоя Падліпская была аўтарам або сааўтарам шматлікіх кніг, прысвечаных Беларусі: «На прасторах любай Беларусі», «Краіну родную люблю». Перакладала на беларускую мову кнігі. Напрыклад, (выданне «Сістэма каардынат») у літаратуразнаўца і педагога Аляксандра Бельскага яна пыталася аб беларускай літаратурнай адукацыі, а ў мовазнаўцы Віктара Іўчанкава — пра развіццё беларускай мовы. Сапраўдная цікавасць аўтара да Беларусі і дазволіла ёй задаваць глыбокія пытанні героям, а таксама выклікаць у іх прыхільнасць да сябе.

У анатацыі сказана, што кніга прызначана для шырокага кола чытачоў. Асабліва яна будзе цікавая філолагам. Так, большасць герояў інтэрв'ю звязаны з літаратурай і мовазнаўствам і найбольш вядомыя ў вузкім філалагічным асяроддзі. Не так шмат людзей ведае рэдактараў беларускіх выданняў або мовазнаўцаў і сочаць за імі. Не менш спадабаецца выданне тым, каго цікавіць калялітаратурнае жыццё ў Беларусі.

Асабліва падыйдзе яна пісьменнікам-пачаткоўцам. Па-першае, кніга распавядае, што паўплывала на светапогляд і жыццё ўжо сталых пісьменнікаў. Па-другое, яна змяшчае шмат баек з іх жыцця і жыцця многіх рэдактараў літаратурных выданняў.

«Сістэма каардынат» — эксперымент, які дае шанец чытачу зразумець, як фарміруецца лёс чалавека. Яна можа дапамагчы адказаць на пытанне, што робіць людзей такімі, якімі яны становяцца.

**Максім ЖУК**

# Як у звычайным жыцці...

**У дапытлівых маленькіх чытачоў Алесь Карлюкевіч даўно знаны і распазнаны. Ім палюбіліся яго кнігі «Зорны шлях белых гарлачыкаў», «Прыгоды Шубуршуна», «Крыніца паноў Ельскіх», «Падарожжа паштовай маркі», «Цёплыя назвы Яе Вялікасці Вады» і іншыя. Дарэчы, Шубуршун — удалая мастакоўская знаходка Алеся Мікалаевіча.**

Не сакрэт, што аўтарам, якія пішуць для дзяцей, асаблівы поспех спадарожнічае тады, калі не толькі займальна расказваюць пра таго ці іншага персанажа, а і прыдумваюць такога героя твора (ці твораў), якога больш нідзе не напаткаеш.

Але кніга «Бацькі заўсёды добрыя», што выйшла ў «Выдавецкім доме "Звязда"», іншага кшталту. У ёй адсутнічаюць незвычайныя сітуацыі. Аднак, што важна, усё праўдзіва, як у паўсядзённасці. У апавяданнях, якія склалі яе змест, — звычайнае жыццё сённяшніх дзяцей. Такое, якім яно і бывае ў сапраўднасці.

Як быццам, нічога адметнага. Усё звыклае. Ды так падаецца толькі на першы погляд, бо нярэдка нават непрыкметны ўчынак шмат гаворыць. Любая ж сітуацыя ўзнікае не сама па сабе. Учынкі герояў выяўляюць рысы характару хлопчыкаў і дзяўчынак. Нярэдка гэта — і не па гадах сур'ёзнае стаўленне да жыцця. Як у Лёшкі — героя апавядання «Кошык грыбнога смецця», якім кніжка адкрываецца.

Адпачываючы ў вёсцы, ён з мамай і дзядулем пайшоў у грыбы. Вельмі абрадаваўся, знайшоўшы «на невялікай палянцы сярод верасовых кусцікаў» крамяны баравічок, але пасля

«грыбы, як на зло, не трапляліся на вочы». Затое «ледзь не праз кожную сотню крокаў — ці чарговы пакет з поліэтылену ці якая-небудзь металічная бляшанка». З урокаў біялогіі Лёшка ведаў, якая ад гэтага шкода. Не да грыбоў яму стала. Пачаў гэты друз збіраць у кошык. Балазе, вялікім ён аказаўся. Вяртаючыся дамоў, завезлі гэтае смецце на гарадскую звалку.

Дзяўчынка з апавядання «Як Наташка збіралася стаць прыбіральшчыцай» — таксама з тых дзяцей, якіх не толькі гулі-забавы цікавяць. Ахвотна дапамагае бабулі — прыбіральшчыцы ў школе: «Любімы занятак Наташкі — выціраць школьную дошку. Бабуля нават ужо і не правярае ўнучку, ведае, што дзяўчынка ніколі не падводзіць. І дошка будзе блішчаць». Аднак родзічы вельмі здзівіліся, калі дзяўчынка прызналася, што, падрасшы, таксама стане прыбіральшчыцай. Толькі бабуля да ўсяго паставілася спакойна: «Працуе дзіцятка, як дарослая, і ўсё ў яе атрымліваецца вельмі прыгожа! Паверце, з такой руплівіцы вырасце добрая гаспадыня».

Як ні пагадзіцца з гэтым. Ды і з тым, наколькі праўдзівым атрымаўся ў Алеся Карлюкевіча Цімафей, якому «чатыры гады. Хлопчык ён цікаўны і гаваркі. Часам, як лічаць дарослыя, дужа цікаўны і дужа гаваркі». Пра яго расказваецца ў апавяданнях «Спаборніцтва сяброў» і «Чарапаха з правамі». Другое з іх найбольш цікавае: «Нядаўна Цімафей спрабаваў высветліць элементарнае пытанне: "А чарапаха без панцыра — гэта яна голая ці бяздомная?.."» Ёсць над чым паразважаць не толькі самому літаратурнаму герою, а і юным чытачам. Твор выклікае ў дзяцей актыўнасць, прымушае іх задумацца не толькі над жыццём, а і над тым, што ў прыродзе, здавалася б, усё такое простае, а ў сапраўднасці інакш.

Усяго ў кніжцы восем апавяданняў. Апроч згаданых — гэта «"Прашу прабачэння…"», «Чужая мара», «Якога колеру лыжка?» і тое, што дало ёй назву. За гэтай, як на першы погляд дыдактычнай назвай — «Бацькі заўсёды добрыя!..» — важкі сэнс і не менш значны выхаваўчы момант. Слаўка, якога мама пакрыўдзіла, хай сабе і за непаслушэнства, адмаўляецца ехаць з бабуляй. Ён упэўнены, што «бацькоў трэба заўсёды любіць. Ім цяжка. Яны і злоснымі заўсёды застаюцца добрымі».

Сам свет маленства ва ўсёй яго шматграннасці паўстае ў новых творах Алеся Карлюкевіча. Гэтая яго кніга, як і папярэднія, знойдуць свайго ўдзячнага чытача. Асабліва калі таму паспрыяюць дарослыя: бацькі, дзядулі і бабулі, настаўнікі.

**Віктар КАРНЕЙЧЫК**

Соф’я ШАХ

# Лецішча

## Вянок санетаў

1

*Сем сотак прыгалубленай зямлі*
*ля Здудзіч, — вёскі роднага раёна, —*
*на тым бугры, што горбіўся ў быллі,*
*дзе травы незапамятна ўраслі*
*у жоўценькі пясок і сталі дзёрнам.*
*А мы сабе куточак набылі,*
*а мы яго прысвоілі законна,*
*ачысцілі, ўзаралі, узнялі,*
*прасторную хаціначку ўзвялі —*
*і нашым стаў ён радасным палонам.*
*Адна зіма — не ўдзельніца старанняў.*
*Адна зіма нібыта ўсё злуе,*
*адна яна пакуль не прызнае*
*сем сотак намаганняў і адхланняў.*

2

*Сем сотак намаганняў і адхланняў*
*вясною, летам, у асенні час —*
*ад пацяпленняў да пахаладанняў,*
*звычайна ад світанняў да змярканняў*
*дарэшты забіраюць-поўняць нас.*
*Каторы год між гэтых чаргаванняў,*
*і хай яны снуюцца сотні раз,*
*але ні патайных зачараванняў,*
*ні захапленняў, ні замілаванняў*
*нікольки не паменее запас.*
*Таму што мы з’явіліся-прыйшлі*
*сюды, дзе цешаць зрок*
*не толькі градкі, —*
*дзе ўражваюць зайцы ды курапаткі,*
*дзе чаплі, ды буслы, ды жураўлі.*

3

*Дзе чаплі, ды буслы, ды жураўлі,*
*дзе спевам апантаныя салоўкі*
*бярэзінскае ўлонне занялі,*
*яго пераканаўча абжылі*
*пад самым бокам пракаветнай вёскі.*
*Дзе лебедзі адданасць зберaглі,*
*вяртаючыся з доўгае вандроўкі*
*праз сажалкі чужыя і палі,*
*праз рэкі, што заманліва цяклі*
*то ў вабныя азёры, то ў сутокі.*
*Дзе вербалозы сто гадоў цвілі*
*і яшчэ столькі ж гэтае паўтораць,*
*дзе зладжана зямную еднасць твораць*
*стракозы, жабы, пчолы, матылі.*

4

*Стракозы, жабы, пчолы, матылі*
*і розныя мурашкі, мошкі-мушкі…*
*Уласную фантазію разві:*
*без іх ваколле вечнае ўяві, —*
*якімі будуць уяўленні-думкі?*
*А гудам-зумканнем свой слых абві,*
*а ўслухайся ў жабіны вэрхал гулкі:*
*адны з іх скрозь імкнуцца да любві,*
*другія прагнуць нейчае крыві, —*
*ва ўсіх свой клопат просценькі ды юркі.*
*Бо ўсе яны, усе яны дазвання,*
*і глебу засяліўшы, і ваду,*
*паветра прохаладзь і душнату,*
*штогод сцвярджаюць*
*сутнасць існавання.*

5

*Штогод сцвярджаюць*
*сутнасць існавання*
*і раўнавагу свету надаюць*
*уласным пырханнем, і трапятаннем,*
*і несупынным поўзаннем-снаваннем,*
*і тым, што зумкаюць, звіняць, гудуць.*
*Адных, урэшце, жаб неўтаймаванне:*
*так прагна стогнуць,*
*кумкаюць,*
*равуць,*
*як бы ад іх ад кумкання-стагнання*
*ужо залежыць светаўладкаванне*
*і ўсё, усё, што можна бачыць, чуць…*
*І сапраўды, так існасна калі*
*яшчэ б мы сутнасць гэткую спазналі?!*
*Так што не толькі лецішча*
*ў той далі —*
*сем сотак — высілкі ды мазалі.*

6

*Сем сотак — высілкі ды мазалі.*
*Чаго-чаго, а гэтага хапае, —*
*так справы агародныя ўплялі,*
*садовыя так шчодра абвілі,*
*што ўжо і дух парою знемагае.*
*А дзень міне —*
*і ў гарадскім жыллі*
*той самы дух спакою зноў не мае,*
*як бы ў яго хто прагу засяліў,*
*як бы яго хто крыллем надзяліў,*
*а ў той куток ляцець не адпускае.*
*Утома ўтомай, а няма ваганняў,*
*ці трэба ён, ці не, — за вёскай кут, —*
*ужо вярхоўная над намі тут*
*улада развітанняў і вяртанняў.*

7

*Улада развітанняў і вяртанняў,*
*як бы ўжо і жыцця няма без тых,*
*капанняў, розных сеянняў-саджанняў,*
*праполванняў, рыхленняў, паліванняў,*
*і зноў такога ж паўтарэння іх.*
*Як бы і мы —*
*не мы без тых змаганняў*
*за гушчыню цвіценняў непустых,*
*за хуткаснае ўсходаў прарастанне,*
*за іх зялёнае, жывое ззянне,*
*за існаванне завязяў тугіх…*
*Штораз ляцелі б, каб лятаць маглі,*
*на той бугор адхоністы надрэчны,*
*на той прастор бярэзінскі*
*спрадвечны —*
*у свет, дзе і былі як не былі.*

8

*У свет, дзе і былі як не былі, —*
*каторы год, а ўсё нібы нанова,*
*бы там і высь інакшай глыбіні,*
*бы там і сонца большай цеплыні*
*ад саменькай пары сакавіковай.*
*Як бы ўжо там накшталт якой радні*
*і побач лес у змрочнасці хваёвай,*
*і побач луг прывольнай шырыні,*
*рака, дзе шчупакі ды акуні*
*на спінінг так бяруцца паспяхова…*
*А ці то мы зямлі той памаглі,*
*а ці яна сабою нам спрыяе,*
*але душа яскрава адчувае:*
*не столькі аддалі, як узялі.*

9

*Не столькі аддалі, як узялі,*
*бо сэнс жа і не ўвесь у тых турботах,*
*якім так аддаюцца тыдні-дні*
*у самыя то ў мошкі, авадні,*
*то ў камары, з якімі скрозь нудота.*
*Не ўсё —*
*гурочкі, морквы, кавуны*
*ды вішні, слівы, грушы год за годам, —*
*увогуле вяршкі і карані,*
*з якімі стомнай гэтулькі вазні,*
*хоць завіхацца ўсё-ткі — асалода.*
*І тут не абысціся без прызнання:*
*які занятак той ні клапатны,*
*а ёсць і ад яго плён патайны*
*для спеўнага дыхання і гучання.*

10

*Для спеўнага дыхання і гучання*
*нам раскашуюць травы і кусты,*
*хары птушыных свістаў,*
*шчабятанняў,*
*курлыканняў, ціліканняў, куванняў*
*між водараў настоена густых.*
*Для нашага ізноў жа хвалявання*
*там споведна шапочуць чараты,*
*а ў вымытых рачных адлюстраваннях*
*то аблачынак песціцца люлянне,*
*то промняў сноп зіхціцца залаты…*
*Сама душа не вытрымае — скажа,*
*ой разгукана скажа-прапяе*
*уражанні імпэтныя свае:*
*сем сотак —*
*а як бы ўсё ўлонне наша!*

11

*Сем сотак —*
*а як бы ўсё ўлонне наша,*
*увесь, што прад душою, кругагляд,*
*які нам Богам дораны, не йначай,*
*каб мы лічылі лёсавай удачай,*
*што там расце і наш адметны сад.*
*Ад самай веснавой пары гарачай*
*да той, калі сыходзіць лістапад,*
*мы з радасцю амаль што ўжо дзіцячай,*
*а для натхнення звышпераканаўчай,*
*адвечны бачым жывапісны лад.*
*І дзівімся захопленасцю ўсёй*
*разгорнутаму Боскаму ваколлю*
*з яго цяплом, з яго журботнай золлю,*
*з яго паветрам,*
*цемрай, светлынёй.*

12

*З яго паветрам, цемрай, светлынёй,*
*з яго вятрамі…*
*О як жа шчымліва*
*у іх прысутнічаць любой парой*
*і спасцігаць іх вечны неспакой*
*на гэтай любаснай зямлі цярплівай!*
*А зоры скрозь якія па-над ёй!*
*Якою мовай тонка-зіхатлівай*
*перамаўляюцца паміж сабой*
*і з цішай адухоўленай начной,*
*што нат не назавеш яе маўклівай…*
*А наш бугор —*
*нібыта аналой*
*ва ўлонні тым, з якім гаворыць неба,*
*з якім і на жыццё маліцца трэба,*
*яго ўслаўляць за сотаю вясной.*

13

*Яго ўслаўляць за сотаю вясной,*
*калі яно — часцінка гэткай шыры,*
*удзячна і адкрыта прад якой*
*замала й расхінуцца ўжо душой,*
*напоўненай гучаннем вышняй сілы.*
*Такі прачула ўзрушаны настрой,*
*такі запал наструнены ды шчыры,*
*што абазнач мяжу, скажы «адбой»,*
*хоць крыкні ліхаманкавае «стой!»,*
*а для душы —*
*свае арыенціры.*
*Не збітую ніякім брудам-фальшам,*
*пець і праз век вось гэту прыгажосць*
*ужо Сам Бог, Сам Праведны Гасподзь,*
*здаецца, нас аднойчы абавяжа.*

14

*Здаецца, нас аднойчы абавяжа —*
*і станем, о як станем славіць мы,*
*і веснім чараваныя пейзажам,*
*услед і летнім, восеньскім —*
*а як жа! —*
*і нават — так! —*
*выявамі зімы…*
*Мароз націсне, сонечна адляжа,*
*туманы заблакіцяцца, дымы,*
*і вецер, што сабой не раз уражваў,*
*наш слых, наш дух таемна бударажыў,*
*вясны чарговай выкліча грамы.*
*І мы ўздыхнём напеўна:*
*«Дожджык, лі*
*і сведкай будзь, які нам свет адкрылі*
*вось гэтыя, як бы на небасхіле,*
*сем сотак прыгалубленай зямлі!..»*

15

*Сем сотак прыгалубленай зямлі,*
*сем сотак намаганняў і адхланняў,*
*дзе чаплі, ды буслы, ды жураўлі,*
*стракозы, жабы, пчолы, матылі*
*штогод сцвярджаюць*
*сутнасць існавання.*
*Сем сотак — высілкі ды мазалі,*
*улада развітанняў і вяртанняў*
*у свет, дзе і былі як не былі,*
*не столькі аддалі, як узялі*
*для спеўнага дыхання і гучання.*
*Сем сотак —*
*а як бы ўсё ўлонне наша*
*з яго паветрам, цемрай, светлынёй…*
*Яго ўслаўляць за сотаю вясной,*
*здаецца, нас аднойчы абавяжа.*

Фота Кастуся Дробава.

# Рэкі памяці

*Апавяданні*

Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ

## Сямейны чамаданчык

Гэта, можа, у іншых сямей — альбомы. Мінулае падклеена да старонак, акуратненька, з подпісамі. Глядзіць дзясяткамі вачэй — упарадкаванае, мірнае.

Альбомы і ў нас вяліся таксама, і досыць шмат. З маімі дзіцячымі фота, падпісаныя прыгожым маміным почыркам. Гады, як плашачкі, адзін за адным, і вусцішна бачыць, як няўмольна змяняешся. З бацькоўскімі фота, мамінай і татавай маладосцю, з агульнымі здымкамі іх школ ды вучэльняў. Тут ужо здымкі з-пад вокладак высыпаюцца, сям-там абрэзаныя, надарваныя. Сям-там з часопіснымі выразкамі: то келіх (яўна замежны, багаты такі, сыты келіх) да застолля падклеены, то выразаныя з паштоўкі кветкі з пазалотаю.

А яшчэ, звыш таго (і перш за ўсе альбомы) у нас быў чамаданчык. Маленькі, са скругленымі бакамі, са зламаным замком. Ды і не зачыніўся б, столькі там фота. Ляжаў той чамаданчык на баку ў бабулінай шафе, побач з шалікамі і закручаным у пакет парыком. Парык бабуля не насіла ніколі: сваіх кудзераў ставала. Але парык ляжаў сабе:

— А раптам прыдасца?

Так захоўваліся ў нас — на выпадак, калі, нарэшце, прыдадуцца — многія рэчы. Нейкія дзіўнаватыя шалі з дробнымі грузікамі ды пінцэтам, пластыкавая канструкцыя, куды трэба было ўстаўляць для падагрэву дзіцячыя бутэлечкі (і якая даўно зламалася, але магла б прыдацца). Многае, многае яшчэ. На антрэсолях, у сценных шафах, у шафах звычайных. Кожны чалавек за жыццё абрастае рэчамі, а калі ў адным доме жыве некалькі пакаленняў, рэчаў тых — мора.

А з той шафы («гардэроба») патыхала бабуліным пахам — сухаватым, трохі даўкім водарам яе духоў. Рудое футра каўнера ад нейкага старога, ужо не існуючага паліто. Сукенкі на выхад, строгія працоўныя касцюмы. Купленыя або сваімі рукамі пашытыя. Бабуля мая заўжды любіла франтаватае адзенне. І цяпер любіць, зрэшты. Іншая бабуля — маладая, з кучаравымі валасамі да плеч, у светлай сукенцы — на шафу глядзіць са сцяны. Дзед побач з ёю, таксама малады, твар радасны і трохі здзіўлены, быццам сам не дужа верыць, што вось ён, тут, побач з бабуляй.

Заўжды дзіўна было бачыць іх, маладых, чорна-белых. Ведаць, што гэта яны, заўважаць асобныя рысы, нібыта знаёмыя. І ўсё адно не пазнаваць.

Так і з тым чамаданчыкам, распухлым ад успамінаў. Вывальваліся, высыпаліся, вылiваліся адтуль хваляю чорна-белыя (з зубчыкамі па краі і без) здымкі розных, незнаёмых і паўзнаёмых, групамі і паасобку. Кожны распадаецца на штрышкі, на рысы. Вось тут вочы як у бабулі, а тут кудзеры, а тут лоб зусім дзедаў. А мо і не дзедаў. А во бялявая дзяўчынка ў начоўках у густой траве. Мама. А тая другая, сталейшая, з тоўстай касой, з другога фота — цётка. І ўсе раскладаюцца на асобныя драбочкі, на складнікі.

І ты сам раскладаешся разам з імі. Дакладней, ты — з іх усіх складзены.

— Нос у цябе зусім прабабулін, ну вось бачыш?

Я не бачу, але ківаю. Мне носа, калі на тое, не шкада.

Абы толькі глядзець, нахінаючыся над чэравам чамаданчыка. Перабіраць асцярожна, ашчадна. Глядзець.

## Маня

…прабабку маю звалі Маняй. Марыяй па дакументах, вядома, а так — Маня і Маня. Значна пазней, калі яе даўно не было на свеце, а я студэнткаю філфака завітала ў вёску на Пружаншчыне, дзе прабабка калісь жыла, жвавыя бабусі, на мяне паглядзеўшы, сказалі:

— А-а-а, ну, гэта Маніна, ясна!

Вылучылі нейкія адны ім вядомыя рысы і складнікі. Вылучылі, пазналі Маню — ува мне. Пэўна, гэтаксама, як добрага сябра пазнаеш на даўняй яго дзіцячай фотакартцы.

Яна — Маня — шмат чаго ўмела рабіць. І вышывала, і шыла, і вязала, і гатавала. Чаго толькі не рабіла. Калаўрот Манін пасля доўга стаяў ужо ў гарадскім хлеўчыку. «А можа, прыдасца». І не прыдаўся, канешне.

Мне расказвалі пра яе — драбочкамі, кавалачкамі. Што пахавала мужа зусім маладым, што немаўляткам памёр сын. Адна дачка, мая бабуля, засталася. А замуж Маня болей не пайшла, хоць прыгожая была неймаверна, хоць ахвотных кавалераў ставала.

А пасля была вайна. Маня з маленькай дачкой хадзіла ў лес, носячы перадачы партызанам. Мыючы мужчынам бялізну, выпякаючы для іх хлеб. Каб і ў лесе маглі жыць па-чалавечы. Праносіла праз кардоны: жанчыну з маленькай дачкой прапускалі свабодна. Не будзе ж сапраўдная mutter рызыкаваць дзіцем! Хто-ніхто больш жаласлівы з салдат нават гладзіў дзяўчо па галоўцы. Вядома ж, сіротка.

Шкадавалі.

Маніных бацькоў немцы спалілі ва ўласнай хаце. Без шкадавання. За сувязь з партызанамі, здаецца. А мо і без усякай сувязі, проста каб адабраць нажытае. Каб вызваліць месца для будучых унтэрмэншаў. Ці проста таму, што хацелі вынішчаць, і гэтыя старыя, іх хата і сад, увогуле іхнія жыцці не мелі аніякага значэння для тых сытых малайцоў.

Мані з дачкою тады не было са старымі. Але праз дзень-два ўночы яна прыйшла на папялішча і рукамі адкопвала косткі, каб пахаваць як належыць.

— Не хадзі, — ёй казалі. — Будуць шукаць, схопяць!

Шукалі, сапраўды. Таму тыя, каму Маня насіла хлеб, вырашылі вывесці яе з дачкой з акружэння. Пайшлі — і трапілі пад кулі, бо фронт падступіў зусім блізка. Маня, абдымаючы дачку, ляжала ў барознах на полі, баючыся падняць галаву, і плакала ад адчаю. А дачка — мая бабуля — якой хтось з партызанаў даў (каб дзіця не баялася) сухарык, адзіная спакойная з усёй маленькай групы, грызла пачастунак і гладзіла маці бруднаю ручкай па твары:

— Ты чаго? Ты не плач. Усё добра будзе.

Усё і было добра — іначай не было б мяне. Фашысты адступілі, прыйшлі Саветы. Бабулю гладзілі па галаве ўжо салдаты ў гімнасцёрках. Гэтыя частавалі тым, што мелі — цукрам, хлебам.

Жаласлівасць і чалавечае спачуванне ўсё-такі якасна розныя рэчы.

А пасля вайны Мані, якая жыла тады ў сваякоў (бо не было куды падацца), сустрэлася варожка. Ішла паўз хату, пэўна, даўно ішла, зусім стомленая была, здарожаная. Папрасіла вады. Маладая зусім жанчына, чарнавокая, чорнавалосая, з дзіцем, прывязаным да грудзей. «Цыганка», — падумала Маня.

І на прапанову паваражыць адмахнулася, з напускной весялосцю адказала, падаючы ваду:

— Што мне варажыць? У мяне муж у хаце, дзеці вунь па падворку бегаюць.

Жанчына ж нахмурылася, пакрыўдзілася нават:

— Я не цыганка, а балгарка. Муж твой, сэрцайка, даўно пайшоў да Абрама на піва. А дзяцей тут тваіх — адна дачка, і тая на зямлі працаваць не будзе.

Бабуля сапраўды на зямлі не працавала: стала настаўніцай. Байку пра балгарку-варожку яна мне і пераказвала. Што яшчэ Маня ад яе пачула і ці ўсё з таго спраўдзілася, не ведаю. Але да працы на зямлі ніхто з Маніных унукаў і праўнукаў так і не вярнуўся.

Маня ж працавала, пэўна, да апошніх дзён. Увогуле, спраўная была. І кветкі любіла. А кветкі — яе. Так бывае, што ў некаторых людзей усё расце ды вядзецца. Вось у Мані так і было, ажно зеленаватае святло ў пакоі, бо ўсё спрэс застаўлена кветкамі.

А тыя ж вясковыя бабусі, ад якіх я планавала запісваць што-нішто для фальклорнай практыкі, калі прыгадвалі сяброўку, паўтаралі найперш адно слова — песенніца. Спявала ж лепей за ўсіх і столькі ж песень ведала, а-ёй!

— Вось яна б табе наспявала, вось яна наспявала б!..

Праз усё жыццё — і з песняй. Іначай як жыць?

* * *

Але вось жа. Мне — не наспявала. Памерла, калі мне было восем. Выходзіць, размінуліся ў часе, не сустрэліся тады, калі я гатова была б ад яе той песенны дар пераняць, падхапіць. Далей панесці. І апошні мой успамін пра яе — самы балючы, самы пакутны. Тады Маня, хворая, слабая, маленькая, ляжала ў гарадской кватэры. Як цяпер бачу: цягне да мяне руку, а мову адняло, і сказаць нічога не можа. І толькі гукае каротка: «А! А!» Можа, спрабавала паклікаць па імені, а сілы і словаў ужо не ставала.

Помню, як мне было страшна. Не абяссіленай, высахлай ад хваробы Мані баялася, а таго, што з ёю здарылася. Яе маленькая сухая рука, калі мяне са стрыечным братам прывозілі да яе ўлетку, заўжды поўнілася цукеркамі, ягадамі ці гарэхамі. Заўжды нешта давала. А ў тую апошнюю нашу сустрэчу рука была пустая і цягнулася да мяне.

Утрымаць бы яе.

* * *

Першая ж наша з Маняй гістарычная сустрэча захавалася на адным з фота з запаветнага чамаданчыка. Сядзім мы — мне, пэўна, і году няма — пад навагодняй ялінкай. Гэтыя ўпрыгожанні ў нас і цяпер засталіся дома, у старых кардонных скрыначках. Савецкія, з тонкага каляровага шкла. Серабрыстыя хаткі з чырвонымі (быццам асветленымі знутры) вокнамі, і лупатая сава на прышчэпцы, якую можна да галінкі прыладзіць. І залаціста-зялёныя пералівістыя яблыкі, і вінаградная гронка, і хітрыя лісічкі з пузатымі мядзведзікамі.

Пад ялінкай сядзім мы з Маняй і глядзім у аб'ектыў. Яна спакойна, трохі стомлена, я — успуджанымі круглымі вачыма.

Нос у мяне, мне казалі, зусім прабабулін.

Драбочак, частачка — ад яе.

* * *

Я нясу Маню з сабою.

Усё яшчэ трымаю яе за дрогкую руку.

## Мікалай

— У партрэтаў вочы заўжды на цябе будуць глядзець, як ні павярніся, куды ні стань.

Я спрабую з-пад позірку з партрэта вырвацца. Перасаджваюся з нізкага фатэля (адвалілася адно кольца, таму зняслі і астатнія) на зялёную канапу. Адступаю да вакна, да прычыненых дзвярэй на балкон, поўны хрусткага зімовага паветра.

Позірк з партрэта сочыць. Не адрываецца. Цягнецца за мной, быццам нітачка.

І ўспаміны на нітачку нанізваюцца, адзін за адным. Пацеркамі.

Нанізваюцца, а нітачка трымціць. Напялася, задрыжала.

* * *

Дзед, калі быў жывы, ніколі не глядзеў вось так, як на партрэце. Зрэшты, я яго кепска памятаю, таму не магу сказаць упэўнена, як ён глядзеў. Як трымаўся, як размаўляў. У галаве існуе толькі нейкі агульны вобраз, цень з ранніх успамінаў, рукі, што трымаюць і гладзяць па валасах. Рэха голасу — як тэлевізар з-за сценкі. Чуеш, нібыта, але не разабраць слоў.

Пацеркі-ўспаміны, быццам асобныя ўспышкі. Памятаю, як трохгадоваю плакала з адцяжкаю ў хрып у дзеда на руках, а ягоная рука прыціскала мяне да грудзей. І голас дзедаў гучаў над маёй галавой дакорліва, не мне, а, пэўна, маці маёй:

— Нашто ж ты так?..

Словы змазваюцца, сплятаюцца. Можа, і не гэта было сказана, і не так. Але руку на маёй галаве, руку, што суцяшала і бараніла, помню выразна. Цёплая цяжкая рука, спрацаваная, стомленая, але ўсё яшчэ моцная.

Дзедавы жылістыя рукі сапраўды былі моцнымі. Працавалі нястомна, увесь час нешта ўладкоўваючы ў хаце, увесь час нешта ўдасканальваючы. Пасля, калі яго ўжо з намі не было, заставаўся ягоны інструмент. Заставаліся сляды ягонай працы ў хаце: скажам, дадатковыя рэбры батарэяў, неяк хітра прыладжаныя пад падваконнямі. І лоджыя, спрэс металічнымі палосамі абшытая, і сценныя шафы з антрэсолямі. І недабудаваная — бо дабудоўваў няспынна, але так і не закончыў, не паспеў — дача.

Пэўна, пасля ягонай смерці мы там і не бывалі асабліва. Бо ў недабудаванасці, у незавершанасці заставаўся ягоны рух і імпэт, і ад гэтага было чамусьці балюча.

Дача мусіла быць вінаграднай, так дзеду бачылася. Ён усё марыў пасадзіць там лазу, каб пасля вырасла, апляла наш дамок цалкам. Каб на тэрасе піць чай усім разам у вінаградным ценю.

Але без дзеда ні вінаградны цень, ні тое «разам» не былі магчымыя. І ўсе гэта разумелі — ці, прынамсі, адчувалі. Дачу прадалі, машыну дзедаву, блакітную, дагледжаную, працавітую (колькі мяхоў з бульбай перавезла, колькі поўных збанкоў ды вёдраў!), прадалі таксама.

І быццам прадалі ўспаміны. Пра тое, як з дзедам хадзілі на раку за рыплівай брамкай, цераз луг. Дробныя жабкі спуджана рассыпаліся ад нас у розныя бакі, конікі цягнулі адну і тую ж доўгую ноту, і сонца смажыла. Рака дыхала з-за лугоў лясною свежасцю — дзікая, каламутная, няўрымслівая рака.

— Там пад карчагамі і ракі калісьці жылі. Рукамі лавілі.

Ракі. Рэкі. Рака памяці.

Рэкі памяці цякуць у два бакі. І я падымаюся па сваёй рацэ, цяку разам з вадою назад. Далей і далей…

# Засевак жывых астравоў

**Не такі і часты ў літаратуры выпадак, калі адзін пісьменнік, выступаючы ў розных жанрах, дасягнуў бы вялікага поспеху. Але Віктар Гардзей сваёй творчасцю яскрава засведчыў гэта. Яго паэзія — настолькі прасветлена-лірычная, што такое ўражанне, быццам увабрала ў сябе ўсю пяшчоту Палесся з ягонай нерушавасцю.**

Проза таксама не пазбаўлена лірычнасці. Аднак яна і з філасофскай засяроджанасцю, дзякуючы якой ва ўсёй шматграннасці зноў жа спасцігаеш непаўторнасць зямлі гэтай — пачынаючы з вёскі Малыя Круговічы Ганцавіцкага раёна, у якой ён нарадзіўся 19 жніўня 1946 года. Ды і саміх палешукоў — мудрых, дасціпных і, канешне ж, таленавітых і працавітых.

Творы для дзяцей, напісаныя ім, — такое багацце фантазіі, што дзіву даешся. Прасякнуты яны і тонкім гумарам, які высвечваецца дыяментамі-іскрынкамі. Ім жа, дарэчы, напоўнены і шмат якія празаічныя творы аўтара.

Публіцыстыка Віктара Гардзея — нязменная выразнасць жыццёвай пазіцыі. Хоць у параўнанні з многімі пісьменнікамі ён, як кажуць, не трыбун, затое, калі нешта напіша, за душу бярэ.

Пераклады ж Віктара Канстанцінавіча — нязменная павага да арыгіналу. Разам з тым і ўменне прыўнесці тое сваё, што, не адмаўляючы таленавітасці тэксту, дазваляе ў нечым лепш праявіцца і яго ўласнаму дараванню.

Аднак найбольш ярка талент Віктара Гардзея ўсё ж раскрыўся ў паэзіі. Як «дарослай», так і для дзяцей. Адметныя ж задаткі яго відавочныя ўжо ў першай кнізе «Касавіца» (1975). Акурат з гэтага зборніка і пачалося стварэнне ім уласнага паэтычнага свету, у якім заўсёды ёсць месца спаконвечным матывам дабра, справядлівасці, лучнасці з бацькоўскай зямлёй, любасці да блізкіх людзей.

На паверхню выходзіць толькі сваё — самабытнае, ад чаго хораша і светла становіцца на душы. Як у вершы «Начное неба»:

*Вылежвалася днём, няйначай,*
*Яно, нібы папар, і ўжо*
*Маладзічок у хмарках скача,*
*Як па няўдобіцы плужок.*

*Па ім прыціхлы вечар сее*
*Мільёны год мільёны зор.*
*Начное неба, — як засевак,*
*Дзе ні абмежкаў, ні разор.*

*Маладзічок лязо не сплюшчыць,*
*Арэ ўсё неба, як папар,*
*Затым яшчэ і поўня лушчыць*
*Пасля яго палянкі хмар.*

Шмат падобных твораў (безумоўна, не ў сэнсе паўтору: эксплуатацыю адных і тых жа выяўленчых сродкаў ён ніколі сабе не дазваляе, а ва ўменні ствараць адпаведны настрой, такі паэтычны малюнак, ад якога абавязкова нешта ў душы зварухнецца) і ў наступных яго кнігах: «Верасное паслясловуе» (1978), «Засевак Радзімы» (1983), «Незабудкі азёр» (1985), «Узрушэнне» (1988), «Дзікая пчала» (1994) і іншых.

Тая свежасць і прасветленасць, што заўважалася ў яго ранніх вершах, цягам часу не гублялася, не растрачвалася. Гэта не проста аднойчы прамоўленае, а выказанае тады, калі не ставала сіл, каб устрымацца і не пачаць давяраць свае думкі і пачуцці паперы. У рэшце рэшт, такая і ўся ягоная паэзія. Ён не «вымучвае» вершы, а жыве імі. Яны плоць ад плоці яго самога — рамантыка і летуценніка, які і з гадамі не губляе гэтых якасцей.

Шмат вершаў ён прысвяціў роднай вёсцы. І хоць Малыя Круговічы не заўсёды называюцца, сумнення няма — гэта яны. Вёска для Віктара Гардзея — скарбніца яго лепшых дзён. Як і ўся прырода роднае аселіцы: «За вёску іду, як у храм». З гадамі з'яўляюцца і матывы нейкай душэўнай неўладкаванасці ў тлумным горадзе:



*Фота Кастуся Дробава.*

*Віктар Гардзей.*

*Каб не пабег я рана-раным*
*За вёску і яшчэ далей,*
*Дык не хадзіў бы знерваваным*
*І жыў бы, можа, весялей.*

*Не азіраўся б я праз далі*
*І не хадзіў бы сам не свой,*
*Каб так шалёна не свісталі*
*Шпакі ў тым ранку за смугой.*

Міхась Стральцоў выказаў нешта падобнае праз вобраз «сена на асфальце». Замілаванне паэта — частка замілавання кожнага гараджаніна ў першым пакаленні, які знаходзіцца на своеасаблівых ростанях. Часам яму самотна ў горадзе, хочацца вярнуцца да сваіх вытокаў. Але ці патрэбен ён там? Ды і ад жадання да ўчынку — адлегласць. І далёка не заўсёды жаданне ператвараецца ва ўчынак.

Аднак сённяшняе ягонае ўспрыманне вёскі ўжо не тое, якім было раней. Многае змянілася, змяніўся і сам лірычны герой:

*У лясах, што аж да небакраю,*
*Нехта тут блукае ўжо другі.*
*Стану я на выспе — пагукаю*
*Сам сябе, вясёлага, з імгі.*

Дае аб сабе знаць і іншая, балючая нота. І не толькі таму, што ў родных мясцінах дасюль адчувальны чарнобыльскі прысмак. Прысутнічае і асабісты боль, ад якога нікуды не дзенешся, не схаваешся. Таму і нараджаюцца творы драматычнага зместу, з трагічнай падсветкай:

*Чаму ж так? Гляджу вінавата.*
*Лёс вырваў з пагляду майго*
*І сына-салдата, і брата,*
*І брата яшчэ аднаго.*

Толькі паэт на тое і паэт, што ён разважае і пра жыццё ўвогуле, і пра смерць як заканамернае завяршэнне зямнога існавання чалавека. Пры гэтым ідзе найперш ад асабістага, прамаўляючы вуснамі лірычнага героя:

*Вунь Харона чаўны. І — бязмоўе.*
*Кінуў лёс пакаленні на тлум.*
*У бяроз, як і ў нас, белакроўе,*
*І нямала прасвятлення для дум.*

Але ён дасягае і той высновы, якая дазваляе зразумець, што жыццё бясконцае ў сваёй хадзе і кожны, хто жыве, павінен напоўніцу радавацца яму, ведаючы, што наперадзе чакае штосьці новае, яшчэ нязведанае і неспазнанае:

*Не спяшайце, чаўны, не адчальце:*
*Мноства з'яў таямніцай пакуль.*
*Вось і сёння па мокрым асфальце*
*Вожык бег, а куды і адкуль?*

Не знікаюць з вершаў В. Гардзея смутак, адчай. Аднак усё ж куды больш у іх радасці, светласці, паэтычнай свежасці. Паэт знаходзіць у сабе сілы пераадолець песімізм, душэўную адзіноту. Ягоны лірычны герой спяшаецца жыць, дзяліцца сваімі вялікімі і малымі радасцямі. Гэта асабліва добра відаць па вершах, у якіх апяваецца прырода, што аднолькавая ў сваім харастве ў розныя поры года. Удыхаючы гэтае хараство на поўныя грудзі, пачынаеш упэўнівацца ў тым, што сам ты таксама жывая часцінка гэтага вялікага хараства: «Разумею: я патрэбен // Полю шэраму ў вясне. // Момант ісціны, што ў хлебе, // Па жыцці вядзе мяне». І далей:

*Не сагрэлася б пад снегам*
*Без майго дыхання рунь.*
*Нахапілася адлега.*
*Ручаі бягуць угрунь.*

Праўдзіва сказаў пра Віктара Канстанцінавіча яго старэйшы сябра Мікола Купрэеў: «Знешне традыцыйныя, простыя па форме, вершы яго кранаюць сэрцы чытачоў глыбокім пачуццём, свежым радком, эмацыянальным паэтычным вобразам, які зелянее травой і лісцем, шуміць маем, сінее небам, грыміць добрым громам над роднай зямлёй. Добра, хораша жыць у паэтычным свеце Віктара Гардзея […]».

Пра што б ні пісаў, робіць так, што паэтычны малюнак настолькі зрокава ўспрымальны, якім можа быць толькі на жывапісным палатне таленавітага мастака. Яго паэзія традыцыйная ў сваёй аснове, належыць да класічнай плыні. Ён далёкі ад эксперыментатарства, яго не вабіць мастакоўская мудрагелістасць і вобразная рэбусавасць. У гэтым добра праяўляецца і блізкасць Віктара Гардзея да народнай стыхіі. У яго асобе нацыянальная паэзія мае свайго годнага прадаўжальніка.

Лепшыя творы са зборнікаў «Чырвоны грабеньчык» (1976), «На арэхавай палянцы» (1982), «Коцікі на вярбе» (1988), «Мой тата — трактарыст» (1989), «Зай, які лічыў варон» (1992), «Зайкава балалайка» (1998), «Сарочына цырульня», «Мудры воран» (абедзьве 2013) і іншых даўно сталі хрэстаматыйнымі. Яны ўключаюцца ў розныя калектыўныя зборнікі, падручнікі, дапаможнікі. Адзін жа з іх — «Зайчыкавы ноты» — без перабольшання класічны ў беларускай дзіцячай літаратуры:

*У музычнай школе*
*Зайчык дзень прабыў.*
*— До-Рэ-Мі — фасоля!*
*Ноты ён вучыў.*

*Потым ля загона*
*Рваў струкі за трох*
*І спяваў натхнёны?*
*— До-Рэ-Мі — гарох!*

Рэдка каму ўдаецца так арыгінальна, непаўторна і ў той жа час дасціпна вымавіць тое, што, безумоўна, дзетак не пакіне абыякавымі. Ды і персанаж, такі знаёмы і любімы, што спрыяе яшчэ лепшаму ўспрыманню твора. Дарэчы, заяц, як відаць з кніг, — любімы персанаж і самога Віктара Гардзея.

Асабліва шырокі рэзананс мела яго «Малая дзіцячая Чырвоная кніга». Адзін том яе прысвечаны рэдкім прадстаўнікам фаўны, другі — флоры. Дылогія пра «чырванакніжнікаў» — унікальная з'ява ў беларускай дзіцячай літаратуры. Амаль 20 гадоў аддаў ёй. Атрымалася як бы энцыклапедыя для маленькіх. Вытрыманы алфавітны прынцып падачы матэрыялу, а назвы жывёл, птушак, насякомых, прыведзены ў адпаведнасць з іх сучаснай навуковай кваліфікацыяй. Гаворка пра іх вядзецца як у вершах, так і ў прозе.

Свайго роду працяг дылогіі — кніга «Птушка года Беларусі. 2000 — 2020» (2020). Вершы і замалёўкі знаёмяць з пярнатымі, якія ў пэўным годзе былі названы своеасаблівым сімвалам нашай краіны. Як і заўсёды ў Віктара Канстанцінавіча, яна напісана так, што не толькі дзеткам у радасць яе прачытаць. Чытачу даросламу таксама не лішне атрымаць для сябе карысную інфармацыю.

Празаічныя ж творы Віктара Гардзея вызначаюцца аўтабіяграфічнасцю. Пачынаючы з аповесці «Дом з блакітнымі аканіцамі», што даў назву яго кнізе, дэбютнай у гэтым жанры (1984). У наступнай «Карані вечнага дрэва» (1988) цэнтральнае месца займае аповесць «Жыта ганьбу не заслоніць» з жыцця пасляваеннай заходнебеларускай вёскі. У рамане «Бедна басота» (2003) на прыкладзе Малых Круговіч праўдзіва расказаў пра жыццё Заходняга Палесся ў першыя гады пасля правядзення калектывізацыі.

За кнігу прозы «Уратуй ад нячыстага» (1995) яму прысвоена Літаратурная прэмія імя Івана Мележа. З'яўляецца таксама лаўрэатам прэміі «Залаты Купідон» (2007). Аднак не менш дарагія Віктару Канстанцінавічу і «ўзнагароды» землякоў. Да ягонага 50-годдзя Ганцавіцкі райвыканкам у Малых Круговічах прысвоіў назву вуліцы, дзе правёў ён свае юныя гады. Пазней на месцы хаты, у якой жыў, з'явіўся памятны знак.

У адным з вершаў у зборніку «Касавіца», малады на той час паэт прызнаваўся:

*І заўсёды ў выраі не блізкім*
*Ёсць патрэба бачыць родны дом:*
*Да зямлі сваёй хілюся нізка*
*Ластаўкай перад даждждом.*

Гэты выраз — «Ёсць патрэба бачыць родны дом» у дачыненні да Віктара Канстанцінавіча набывае сёння больш значны і больш шырокі сэнс. У жыцці і творчасці пісьменніка адчуваецца патрэба пастаянна бачыць родную Беларусь — Беларусь, як той дом, у якім жыць усім нам разам. І які будаваць супольна, у меру таленту кожнага. Што і робіць упэўнена паэт, празаік, дзіцячы пісьменнік, перакладчык Віктар Гардзей.

Значна пазней, калі стаў ужо вядомым пісьменнікам, ён напісаў аўтабіяграфічную трылогію «Аселіца ў басейне Чорнага мора». Аселіца гэтая, па ягоных словах, сапраўды зіхацела, свяцілася ўсімі колерамі вясёлкі адразу за хатай, а ў самой хаце «па ўсёй сцяне, дзе тырчыць нейкі цвік, абапал вялікай торбы развешана процьма старых бабуліных каптуроў і чэпчыкаў, якія, сцёршыся да дзірак, яшчэ доўга служаць гаспадыні ў якасці пакоўных торбачак для зёлак». Хлопчыкам, нахадзіўшыся з бабуляй па лясах і лугах, ён ужо і сам добра ведаў, што пры хваробах жывата карысна піць адвар з альховых шышак, глог памагае сардэчнікам і нервовым людзям, а калі ў некага моцны кашаль і ліхаманка, то ад прастуды лепшага сродку, чым гарачы ліпавы чай, на свеце, мабыць, не бывае. Тое, што многія ахоўныя расліны таксама маюць лекавыя ўласцівасці, ён і стараўся падкрэсліць у другім томе сваёй «Малой дзіцячай Чырвонай кнігі». Пры гэтым абавязкова напамінаў, што нельга забываць, які від знаходзіцца пад пагрозай знішчэння. Значыць, трэба падумаць, зрываць тую ці іншую зёлку ці хай лепей расце. Пры хваробе яе можна замяніць іншай, якая больш распаўсюджана.

Кніга «Дзікая пчала» адкрываецца вершам «***На Палессі матчынае мовы…» Ён пра непаўторную родную мову:

*На Палессі матчынае мовы*
*Ёсць яшчэ жывыя астравы,*
*Дзе гаркоту здыме пах мядовы*
*І суцешыць пошум баравы.*

Аднак яшчэ і пра тую нерушавасць, якую сёння напаткаеш толькі ў глыбінцы, на самым ўлонні прыроды:

*Зарыкае поплаў вечаровы,*
*І сціхае бор, пакуль жывы,*
*І, як птушкі, прылятаюць словы*
*На свае лясныя астравы.*

Гэтыя жывыя астравы, астравы лясныя — такія жыццядайныя яшчэ і таму, што ёсць у нашай літаратуры творца, які не толькі не забывае роднай мовы (дзякуй Богу, пераважная большасць пісьменнікаў клопатна ставяцца да яе), але і тым, наколькі таленавіта піша, пастаянна пераконвае: лепш, чым па-беларуску, не выкажаш. А гэта ўжо каму што дадзена.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Паэзія як вялікі сімвалізм вечнасці

**Праца над анталогіяй сучаснай беларускай паэзіі дазволіла блізка пазнаёміцца з багатым жыццёвым і творчым лёсам, яркай, каларытнай мастацкай індывідуальнасцю Міхася Шэлехава.**

Паэт, празаік, кінасцэнарыст, тэатральны драматург, перакладчык, публіцыст Міхась Міхайлавіч Шэлехаў паходзіць з вядомага і аўтарытэтнага палескага роду. Піша на рускай, беларускай і ўкраінскай мовах. Яго творы друкаваліся ў самых аўтарытэтных «тоўстых» часопісах («Новый мир», «Наш современник», «Юность», «Москва», «Дружба народов», «Нёман», «Полымя», «Роман-газета»), альманахах, калектыўных зборніках і анталогіях Расіі, Беларусі, Украіны, іншых краін.

Міхась Шэлехаў публікаваў зборнікі паэзіі ў Маскве — «Слово ненастное, слово лазурное» (1987), «Песни родильного отделения» (1990), «Ангел уличный» (1991); і ў Мінску — «Філасофія свету» (у калектыўным зборніку «Лагодны промень раніцы», 1988), «Сын яблыні» (1990). Ён з'яўляецца аўтарам кнігі арыентальных навел «Калодзеж вечнасці» (2011), рамана «Паляванне на мядзведзя» (2012), вялікай паэтычнай біяграфіі «Птушка нябесная, лілія палявая» (2012).

На ўсёй постсавецкай прасторы М. Шэлехаў вядомы і як драматург. У розныя гады выходзілі п'есы пісьменніка для дарослых і дзяцей, напрыклад: «Ветрык і сметнічкі» (1998), «Чайнік на даху» (1996), «Кузіны казкі» (1990), «Яма» (2002), «Паляванне на зубра» (2003). Яму належыць драма глыбокага філасофскага зместу «Венскі канкан», у якой на сцэне адначасова сустракаюцца Ленін, Троцкі, Сталін і Гітлер. І гэта гістарычны факт — дадзеныя асобы сапраўды былі ў Вене зімой 1913 г.

Міхась Шэлехаў — аўтар сцэнарыяў мастацкіх фільмаў «Круглянскі мост» (1989, паводле аповесці В. Быкава, «Беларусьфільм»), савецка-польскай стужкі «Люк» (1989, кінастудыя імя М. Горкага), «Шакаладны бунт» (1990, Свярдлоўская кінастудыя), «Вогненны стралок» (1994, «Беларусьфільм»), сааўтар тэлесерыяла «Бліндаж» па незакончанай прозе В. Быкава (2011). Па кінасцэнарыях пісьменніка зняты мультфільмы «Пра варону, пра Ягора» (1983, «Беларусьфільм»), «Ноч» (1985, Свярдлоўская кінастудыя), «Дрэва радзімы» і «Багатырская каша» (1986, 1987, «Саюзмультфільм»), «Месяц» («Беларусьфільм», 1993) і інш. У 1987 г. ён дэбютаваў як аўтар песень і вершаў да фільмаў.

Міхась Шэлехаў з'яўляецца лаўрэатам І літаратурнай прэміі імя А. М. Горкага (1988), прэміі Беларускага саюза журналістаў (2002), трох прэмій Міністэрства культуры Беларусі за дзіцячыя п'есы (2002), трох прэмій Міністэрства культуры Беларусі за ваенныя п'есы (2004), Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2004), Валошынскай прэміі ў розных намінацыях (2012—2014), Рускай прэміі (2013), прэмій Саюза пісьменнікаў Расіі «Традыцыя» (2001) і «Імперская культура» (2010). Ён узнагароджаны залатым медалём Дзяржкіно і Саюза кінематаграфістаў СССР імя А. Даўжэнкі (1990), Срэбным Віцязем літаратурнага фестывалю «Залаты Віцязь» (2016).

* * *

Філасофія жыцця і творчасці Міхася Шэлехава добра раскрываецца ў надзвычай змястоўных і цікавых адказах пісьменніка на нашы пытанні, якія прапаную чытачам «ЛіМа».

— Вы сябе лічыце рускім ці беларускім паэтам?

— Ведаеце, усяго за жыццё я напісаў больш за 15 тысяч вершаў на розных мовах і кінуў. Практычна даўно пішу іншую паэзію — філасофскія эсэ і арыентальную прозу. З вершаў — 500 на беларускай, 300 на ўкраінскай, усё астатняе на рускай мове, хоць ёсць спробы і на польскай, сербскай, англійскай. Таму пытанне-праблему можна вырашыць арыфметычна — пераважна рускі паэт, але каранямі і сэрцам таксама беларускі і ўкраінскі. Мама мая — данская казачка, сярод продкаў ёсць рускія, беларусы, забайкальцы, манголы, чаркесы, асеціны, украінцы, як мяркуецца, немцы, магчыма, маньчжуры, кітайцы ці нават выхадцы з Індакітая па адной загадкавай прапрабабулі. Дарэчы, адзін мой стрыечны брат, прафесар у Іспаніі, жанаты з тайванкай. Кажу гэта для таго, каб адзначыць фінал майго жыцця — нарадзіўшыся еўрапейцам і славянінам, я ў апошнія 20 гадоў займаюся культурай аднаго Кітая і вельмі яе люблю. Вось такі паварот лёсу. Памятаю дыскусію Н. С. Гілевіча і Р. І. Барадуліна ў маёй прысутнасці — пра дзіўны парадокс М. Шэлехава, яго білінгвізм. Ён паэт беларускі ці рускі? І ў адных, і ў другіх вершах я выглядаў арганічна. Але яны палічылі, што больш арганічны я усё ж у беларускіх. Яны не ведалі маіх украінскіх, і ёсць там такія, якія я лічу наогул сваімі лепшымі вершамі. На самай справе загадкі няма. Старая руская мова, уключаючы царкоўнаславянскую, вельмі моцна ўбірае беларускую і ўкраінскую. Калі адкрыць вялікі Слоўнік У. І. Даля — знойдзем цэлыя крыштальныя азёры беларускай і ўкраінскай гаворкі. Там такая забытая прыгажосць!

— На якія каштоўнасці ў сваёй творчасці Вы арыентуецеся?

— На царкоўныя — праваслаўе, рэлігійныя — хрысціянства, канфуцыянства, будызм, філасофскія — мноства філосафаў Усходу, Антычнасці і Захаду. На культуры старажытных земляробчых народаў, а яны, як вядома, зарадзіліся на Усходзе, а не на Захадзе. Жыццё тут, на зямлі — толькі нулёўка, падрыхтоўчы клас да вялікай школы ў Сусвеце. Паэты лепш за іншых павінны падрыхтавацца да вялікага свету. Паэт — пясняр, прарок, філосаф, жрэц. Так было ад пачатку, так і сёння. Задачы не змяніліся. Першыя паэты былі шаманамі. Яны былі хадайнікамі, праваднікамі ў свет духаў, у краіну мёртвых, у царства продкаў. Паэт хадзіў туды ў містычным экстазе і прыносіў адтуль параду, папярэджанне, благаславенне ці праклён. Свет сёння завалены гарамі інфармацыі, але людзі па-ранейшаму не бачаць далей свайго носа. І адказ дасць хутчэй прытча, казка, легенда. Ёсць футуролагі, а з прарокамі кепска. І праца паэта ў тым, каб бачыць скрозь час, прастору, матэрыю, гісторыю. Быць аналітыкам, духавідцам, візіянерам. «Лицом к лицу лица не увидать» — гэта формула працы паэта, вучонага, святара, правадыра. І трэба мець мужнасць і сілу бачыць, спасцігаць і ляцець скрозь велізарныя адлегласці. Каштоўнасці паэта — палёты ў сне і на яве. І я шчаслівы, калі зноў лётаю. Як у дзяцінстве. А паэт — гэта вечнае дзяцінства, паэты не старэюць — Божы дар. Самая вялікая каштоўнасць.



*Фота з сайта minsknews.by.*

*Міхась Шэлехаў.*

— Што для Вас самае галоўнае ў паэзіі?

— Я родам з Палесся, якое, як поўдзень Беларусі, украінізавана, палеская «гаворка» гэта даказвае. Таму палешукі і абліччам падобныя да ўкраінцаў, і прозвішчамі. Палешукі і сёння ездзяць у Пачаеўскую і Кіева-Пячэрскую лаўру, а ў даўніну падпарадкоўваліся не Маскве, Вільні ці Варшаве, а Кіеву. Гэта самая старажытная наша памяць — Залатая Русь. А паэт і каштоўны старажытнай памяццю, старажытнай культурай, памяццю крыві, памяццю духу, які памятае ўсё. Біблія кажа нам аб стварэнні свету, але акрамя яе існуюць велізарныя міфалогіі старажытных народаў, велічэзныя моры фальклору ўсіх рас. Вось гэтая глыбокая родавая памяць, якая сыходзіць да пачатку свету, і павінна быць у паэзіі. Я шчаслівы быў убачыць з самалёта Гімалаі, убачыць Кітай, маньчжурскую тайгу, люблю Амерыку як кантынент старажытных культур. Але да знаёмых мацерыкоў быў пракантынент Гандвана, была Атлантыда, і не адна. Аскепкі старажытных эпасаў, страчаных ведаў, рэха глыбінь павінны быць у паэзіі. Вялікі сімвалізм вечнасці. Дзеля гэтага яна і жыве. І шчаслівы паэт, які стварыў свой востраў, царства, даліну, маленькі сусвет. Гэта я ў паэтаў і шукаю як хлеб надзённы.

**Мікола МІКУЛІЧ**

# «Са шчырымі і найлепшымі пажаданнямі…»

**Пра аўтографы заўсёды пішаш, уяўляючы, хто за імі стаіць. Думаеш і пра таго, хто падпісаў кнігу, і пра таго, каму той надпіс адрасаваны… І чым далей адыходзіць час, тым цікавейшымі падаюцца развагі. Ужо нават таму, што за дзесяцігоддзямі шмат што губляецца. І ў развагах сваіх ты часам не так ужо і блізка падбіраешся да ісціны.**

Аўтографы на кнігах, што патрапілі да мяне раптоўна, узростам не такія і даўнія. Адзін надпіс — з верасня 1989 года. Другі — з мая 1988 года. А кніжачкі выдадзены ў адзін, 1988, год, у адной серыі — «З арлінага племені», у адным выдавецтве — «Юнацтва», у адной рэдакцыі, якой загадваў Міхась Пазнякоў. У кніг адзін рэдактар — Л. С. Курбека. Чыталіся яны яшчэ і малодшым рэдактарам — М. А. Паддубскай. Наклады аднолькавыя — 30 000 экзэмпляраў. Аддрукаваны кнігі на Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінаце МВПА імя Якуба Коласа. Вось мастакі розныя. Адну афармляў А. Карповіч. Другую — Л. Малышаў.

Патрапілі да мяне гэтыя кніжачкі ў букіністычным аддзеле сталічнай «Акадэмкнігі». На зборніку Станіслава Шушкевіча (1908—1991) «Апавяданні пра Марата Казея» чытаю: «1.V.1988 г.

Ала Іванаўна Канапелька!

Мае кнігі выходзілі на маёй роднай мове і ў перакладах на рускую і ўкраінскую. Усяго іх ужо атрымалася 50.

Пасылаю Вам гэту невялікую кніжачку.

Станіслаў Шушкевіч».

І — аўтограф Алеся Махнача (1922—2001) на яго дакументальнай аповесці «Дзеці крэпасці»: «Шаноўнай Але Іванаўне Канапелька — на добры ўспамін аб сумесных вандроўках па роднай і блізкай для мяне Брэстчыне. Са шчырымі і найлепшымі пажаданнямі. Ал. Махнач. 26.9.89 г. г. Брэст».

Розныя, хаця ў нечым і падобныя, лёсы ў двух пісьменнікаў, якія прыйшлі ў беларускую літаратуру з інтэрвалам у некалькі дзесяцігоддзяў. Станіслаў Пятровіч Шушкевіч пачаў друкавацца яшчэ ў 1925 годзе. Першую кнігу выдаў у 1934-м. Другую — у 1936-м. А трэцюю — «Лясная калыханка» — ужо ў 1958 годзе. Перапынак звязаны з арыштам у 1936-м. Быў асуджаны на восем гадоў. Вярнуўся ж на радзіму праз 10. А ў 1949-м рэпрэсіраваны паўторна. І вярнуўся ўжо толькі ў 1956 годзе… Зразумела, што хацелася шмат што навярстаць. Таму актыўна друкаваўся. Напружана працаваў у дзіцячай літаратуры. Марату Казею, юнаму партызану, прысвяціў і паэтычную, і празаічную кнігу. Зборнік «Апавяданні пра Марата Казея» ўпершыню быў выдадзены ў 1968 годзе. Перакладзена кніга і на рускую мову — выйшла і ў Маскве, і яшчэ ў Навасібірску…

Алесь Махнач нарадзіўся ў 1922 годзе. Вайну сустрэў камандзірам узвода ў гарнізоне Брэсцкай крэпасці. 27 чэрвеня, цяжка паранены, патрапіў у палон. Да 9 красавіка 1945 года знаходзіўся ў лагеры ваеннапалонных і канцлагерах на тэрыторыі Польшчы, Германіі. Пасля доўгі час лячыўся ў ваенных шпіталях. Дадому вярнуўся інвалідам. Працаваў у бібліятэцы. Друкавацца пачаў з вершамі ў раённай газеце. Завочна скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага (1960). Першая кніга — «Драматычныя мініяцюры» — выйшла ў 1956 годзе… Часта звяртаўся ў творчасці да тэмы абароны Брэсцкай крэпасці. Часта наведваўся ў Брэст, на Берасцейшчыну…

Ала Канапелька (1960—2015), якой адрасаваны інскрыпты, — перакладчыца, паэтэса. Пасля заканчэння філфака БДУ (1983) прыйшла працаваць у Дом літаратара Саюза пісьменнікаў Беларусі. Першая яе кніга — зборнік вершаў «Цвет алешыны» (1985). З 1990 года — у Беларускім фондзе культуры. Пасля — у часопісе «Полымя». Некаторы час — галоўны рэдактар часопіса «Крыніца». У Саюзе пісьменнікаў займалася арганізацыяй пісьменніцкіх сустрэч, юбілейнымі творчымі вечарынамі. Сутыкалася з многімі сябрамі пісьменніцкай грамады. І, відавочна, шмат у каго ўзнікала жаданне падарыць сваю кнігу як нешта дарагое, важнае.

Аўтографы Станіслава Шушкевіча і Алеся Махнача, адрасаваныя Але Канапельцы, — невялікая староначка ў гісторыі беларускай кнігі. Яны — і кнігі, і самі подпісы — як прывітанне з недалёкага ад нас часу. Як адмеціна, што вось яны, дзве з вялікага (як па сённяшнім часе — дык і надзвычай вялікага!) тыражу, не згубіліся, здольны перадаць свае гісторыі, выкладзеныя беларускімі пісьменнікамі, чытачам новых пакаленняў. Дзве кнігі з серыі «З арлінага племені», з той серыі, якой ужо няма, пра якую мала хто зараз успомніць. Як, дарэчы, і няма кніжнага выдавецтва «Юнацтва».

**Раман СЭРВАЧ**

# Прытулак спадчыннікаў Малевіча і Шагала

**Будынак, у якім размясцілася Арт-прастора, адна з найцікавейшых выставачных пляцовак Віцебска, быў узведзены ў канцы XIX стагоддзя ў стылі класіцызму і стаў адным з жылых асабнякоў заможных сем'яў горада. Адрас на той час — Падзвінская вуліца, каля якой было сканцэнтравана культурнае і грамадскае жыццё Віцебска. З 1910 года вуліца носіць імя Талстога, а ў знакамітым доме пад нумарам 7 доўгі час месціцца філіял Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва — Арт-прастора. Акрамя выставак, тут праходзяць музычныя і літаратурныя вечары, адукацыйныя семінары і лекцыі, навуковыя канферэнцыі, кінапаказы, творчыя сустрэчы з мастакамі і майстар-класы.**

## Некалькі слоў пра музей

Эксперыменты знакамітых і далёкіх ад мэйнстрыму мастакоў у сценах будынка з векавой гісторыяй… Усё гэта пра прытулак нефармальных спадчыннікаў Малевіча і Шагала, які называе сябе першым у Беларусі альтэрнатыўным музеем сучаснага выяўленчага мастацтва. Няхай патэнцыянальнага госця не бянтэжаць абшарпаныя сцены і пэўная няўтульнасць: лічыцца, што ледзь не любому арт-аб'екту папярэднічае творчы хаос. Несумненна, экспазіцыі гарманічна дапаўняюць адна адну і надаюць незвычайнаму выставачнаму цэнтру, дзе кожны з дзесяці пакояў адрозніваецца неардынарным дызайнам і экспазіцыйным рашэннем, непаўторную аўру. Дзверы выставачных залаў адкрыты для наведвальнікаў, таму кожны мае магчымасць пераканацца ў гэтым альбо абвергнуць. Увазе чытача прапануем некалькі адметных праектаў, але дададзім, што ў асноўнай экспазіцыі можна пазнаёміцца з творамі такіх віцебскіх мастакоў, як Валянціна Ляховіч, Кірыл Дзёмчаў, Алена Пятрова і інш.

## Наталля Лісоўская. «Цяпло нашага дома»

Наталля Сяргееўна атрымала адукацыю ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя А. К. Глебава і ў Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці. Пасля заканчэння апошняга працавала мастаком друкаванага малюнка на Магілёўскім камбінаце шаўковых тканін.

*Фрагмент экспазіцыі Наталлі Лісоўскай.*

Потым — у родным горадзе, дзе выкладае на кафедры дызайну, а з 1993-га яна — дацэнт Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Працуе ў галіне габелена, у тэхніцы ручнога ткацтва і ў тэкстыльным дызайне. З'яўляецца навукоўцам-практыкам па распрацоўцы і ўкараненні вялікай колькасці структур тканін і малюнкаў на шэрагу беларускіх прадпрыемстваў. Шмат выстаўляецца на рэспубліканскіх і замежных выстаўках.

На пытанне, што прываблівае ў мастацтве габелена, майстар некалі адказала так: «Мой любімы колер — чырвоны. Ён сімвалізуе каханне. Любімы пісьменнік і паэт — Іван Бунін; з беларусаў — Максім Багдановіч. З габеленшчыкаў Беларусі мне даспадобы работы Валянціны Бартлавай, Галіны Крыва блоцкай, Ларысы Густавай, Тамары Лісіцы. Цікавасць да габелена выяўляюць і зусім маладыя мастакі. Гэта значыць, што мастацтва габелена будзе жыць доўга. Захапляюся і жывапісам, але габелену ніколі не здраджваю, бо ў ім — мая душа і сэрца, мой настрой…»

Прыгажосць і захапленне беларускімі традыцыямі ўвасоблены аўтарам з дапамогай поўсці, сізалю, ільну. Творца пераасэнсоўвае мінулае, падвяргае яго мадэрнізацыі, тым самым звяртаючы ўвагу на спадчыну продкаў. Метафары, асацыяцыі, сімвалы — усё гэта характарыстыкі творчых пошукаў мастачкі, здольнай аб'яднаць абстракцыю і рэальнасць. Тэкстыль Наталлі Лісоўскай, вельмі яркі і кідкі (асабліва на фоне сцен без звыклага рамонту), складаецца не толькі з традыцыйнай ніці, але і не адхіляе нечаканыя матэрыялы: кераміку і шкло, драўляныя палачкі і метал, сізаль, лыка і г. д. Як адзначаюць мастацтвазнаўцы, дзякуючы спалучэнню розных па структуры валокнаў і пляценняў, паверхня габелена ажывае, набывае рэльеф, а часам і прасторавую глыбіню.

## Ілья Гусакоў. «Сучасны танец у Віцебску. Канец XX — пачатак XXI стагоддзя»

Галоўныя героі работ Ільі Гусакова — цела танцора і паветра. Яго фотапраект прысвечаны Міжнароднаму фестывалю сучаснай харэаграфіі (*IFMC*), які праводзіцца ў Віцебску штогод з 1987-га. Фестываль стаў першым і да 1997 года заставаўся адзіным форумам сучаснага танца на тэрыторыі былога СССР. Як лічыць стваральнік выстаўкі, знакаміты фэст узнік «на роўным месцы», без якіх-небудзь гістарычных і культурных перадумоў, дзякуючы выключна творчай энергіі пэўнай суполкі. Фотаздымкі аўтар адабраў зыходзячы з жадання адлюстраваць эстэтычную форму і атмасферу *IFMC*. Летась арганізатары абвясцілі перанос свята. Пра лёс сёлетняга пакуль невядома.

Аснова экспазіцыі — эпізоды фестывалю розных гадоў у выпадковым парадку. Аўтар прысутнічаў на кожным і за час, калі змяняліся тэхналогіі, магчымасці фотакамеры і ўвогуле жанры мастацтва, паспеў зрабіць каля 20 тысяч фотаздымкаў на розныя апараты. Дакладную ж колькасць пакуль не падлічваў, але для творцы яна і не мае значэння.

Аўтар наўмысна не суправаджаў экспазіцыю інфармацыяй. Год здымкі, назва калектыву ці танцораў на сцэне, згадка спектакля — гэтага глядач не знойдзе, бо Ілья Гусакоў упэўнены: кожны твор жыве сваім жыццём і не мае патрэбы ў каментарыях. «Многія людзі, якія глядзелі тую ці іншую пастаноўку, заўважаюць, што адлюстраванага на фота яны не бачылі. Перад імі было шоу, а пасля ва ўяўленні кожнага складвалася свая карцінка. Асобны ж момант, які фіксуе фатограф, убачыць адзін з тысячы, — расказвае Ілья Гусакоў. — Да таго ж большасць гледачоў выказвалі такое меркаванне: нават калі пэўны нумар не ўдаўся, фотаздымак перадае зусім іншую атмасферу. І наадварот».

Некаторыя спыняюцца каля работ, якіх, дарэчы, не так ужо шмат, ледзь не на дзве гадзіны. Аднак знаходзяцца і тыя, каму творы такога кірунку зусім не даспадобы. Больш-менш нейтральнымі засталіся самі героі — яны, як правіла, бачаць (і, магчыма, хочуць бачыць) сябе іначай.

## Галіна Васільева. «*Madonna di Vitebsk*»

Мастачка Галіна Васільева вядома сваім захапленнем абстракцыянізмам. У творчай скарбонцы — 17 выставачных праектаў за болей чым 30 гадоў арыгінальнага выяўлення ў творчасці, дзе дамінуюць простыя геаметрычныя формы, суіснуюць лаканічная канструктыўнасць, статычнасць і строгасць кампазіцыйна-пластычных рашэнняў, а таксама выкарыстоўваюцца лакальныя каляровыя плямы. Аднак праект у Арт-прасторы, прысвечаны Марку Шагалу, прадстаўляе выключна графіку, прытым даволі звыклую для вока аматара. Гэтым кірункам мастачка стала займацца ў 2011 годзе, пачынаючы з віцебскіх замалёвак. «30 гадоў Малевічаўскага абстракцыянізму і раптам — Шагалаўская графіка! — крыху здзіўляецца сама сабе Галіна Васільева. — Ніколі не паверыла б, што гэта зраблю, каб мне сказалі некалькі гадоў назад. Але ж так склаліся абставіны. У 2011-м у мяне не стала ўласнай майстэрні. Стварацъ супрэматычныя аб'екты было немагчыма. З'явілася болей вольнага часу, які можна было праводзіць на вуліцах горада. Так, нарадзілася задума адлюстраваць мастацкі твар Віцебска. Вольны час бавіла ў шпацыры па родных вуліцах. І ўбачыла горад такім, якім яго бачыў Шагал, — узнёслым і паветрана лёгкім. А які мастацкі твар у сучаснага Віцебска? Я шукала адказ на гэтае пытанне. Стала рабіць замалёўкі на вуліцах: маленькія, 10 х 15, 18 х 20. А летась, калі пачалася пандэмія, пачала пісаць жаночыя вобразы. І ўсё гэта неяк пераплялося. Тады і нарадзіўся вобраз горада. Вось маюць жа гарады сваю абаронцу-маці: Сіксцінская мадонна, Бразільская, Беларуская, чаму ж няма нашай Віцебскай? Мадонна — маці — жыццё. Гэта мая тэма. Вырашыла — трэба стварыць сваю Віцебскую мадонну. І гэта абавязкова павінна быць Шагалаўская мадонна. Адсюль і стыль маёй графікі: празрыстыя колеры і нябесны палёт».



*Работа Галіны Васільевай.*

На выстаўцы прадстаўлены творы з некалькіх серый: «Віцебская мадонна», «Анёл над Віцебскам», «Імправізацыі на тэму», «Біблейскія сюжэты». Ірына Ніканорава, куратар выстаўкі, у сваю чаргу адзначае: «Калі ўбачыла малюнкі Галіны Сцяпанаўны, то адразу ўявіла іх у нашым памяшканні. Старадаўнія белыя цагляныя сцены і невялікая ўтульная зала — найлепшае атачэнне ўзнёслага сюжэта. Была мэта стварыць цікавую гісторыю. Атрымалася цэльнае апавяданне мастачкі — у стылі Шагала, але ж гісторыя асабіста "васільеўская"».

## Артур Ісачэнкаў. «Без слоў»

Выстаўка жывапісу «Без слоў», якая праходзіць у межах праекта «Імунітэт», прысвечана сучаснікам і іх здольнасці захоўваць сваю індывідуальнасць у часы абмежаванняў і змен «кавіднай» эпохі. З падзеямі і з'явамі, пачуццямі і эмоцыямі, якія прымушаюць маўчаць, любы чалавек можа сутыкнуцца кожны дзень, і гэта настолькі натуральна, што часцяком ніхто не задумваецца пра перадумовы і вынікі. Аднак, падкрэслівае мастак і паэт Артур Ісачэнкаў, маўчанне — гэта таксама размова. Натуральна, вядзе яе кожны — з блізкімі і далёкімі людзьмі, з соцыумам і самім сабой ці, урэшце, са сваімі багамі.

Алегорыя — галоўная характарыстыка творчасці дадзенага мастака. І тут насамрэч не трэба шмат слоў. Артур Ісачэнкаў спрабуе адлюстраваць рэальныя і віртуальныя светы чалавечага існавання, зафіксаваць знешнія і ўнутраныя станы асобы, паказаць непаўторнасць і ўнікальнасць вопыту кожнага, хто здольны думаць, жадаць, марыць. Экзістэнцыянальныя пытанні, на якія шукае адказ творца, выразна гучаць у работах, у многім сімвалічных, але ў пэўным сэнсе рэалістычных. Магчыма, пераважна светлыя колеры, прыемныя адценні, плаўныя лініі і размытыя абрысы герояў-«прывідаў» здатныя прывабіць гледача, але асацыяцыі з арганізмам чалавека, якія несумненна ўзнікаюць, жыццесцвярджальнымі назваць складана. Дысананс у выпадку з карцінамі Артура Ісачэнкава цалкам апраўданы, але знаходзіцца побач з імі проста некамфортна. Што даводзіць: мастак дасягнуў сваёй мэты.

*Работа Артура Ісачэнкава.*

**Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара**

## Андрэй САЎЧАНКА:

# «Хтосьці павінен прыняць адказнае рашэнне»

**Тут можа пайсці дождж у самы сонечны дзень, можна сустрэць сваё першае каханне, у другі, у пяты раз пабываць у Сярэднявеччы і… гандляваць душамі людзей на мясцовым рынку. Тут — на тэатральнай пляцоўцы. Яна робіць магчымым і рэальным многае. Галоўнае, каб хапіла фантазіі. А пакуль ты малады, магчыма ўсё. Няма дзвярэй, якія нельга адчыніць, і ты дазваляеш сабе марыць. Сцэна любіць людзей, якія могуць марыць.**

**Студэнцкі тэатр з кожным годам робіць крок шырэйшым, а хаду хутчэйшай. Прымярае новыя фарматы, новыя думкі, знаходзіць новых людзей, якія ствараюць магію. І пра гэта найлепш ведае чалавек, які «кіруе» яе нараджэннем. Андрэй Саўчанка — педагог па майстэрству акцёра, рэжысёр тэатра, кіно і тэлебачання, акцёр, вядучы і мастацкі кіраўнік тэатра БДУ «На Балконе» — адчыніў для нас дзверы да магіі.**

**— Што для вас студэнцкі тэатр сёння?**

— Студэнцкі тэатр люблю. І студэнцкі тэатр ненавіджу. Люблю, бо там можна амаль усё, няма абмежаванняў. Усе абмежаванні тычацца толькі навыкаў і ўзроўню ўдзельнікаў, але ў студэнцкім тэатры не існуе адпрацаваных механізмаў, якія творчы працэс ператвараюць у вытворчы. Адпаведна студэнцкі тэатр для мяне — поле для эксперыментаў, пошукаў і даследаванняў. І я займаюся гэтым больш за 20 гадоў. Вось такая любоў...

А ненавіджу, бо там бясконцы паток вады: пачынаючы ад пытання, навошта людзі ўвогуле ім займаюцца, і заканчваючы момантам, калі яны не разумеюць, што шукаюць і што спрабуюць ствараць. І таму ўсё маё цярпенне — чаканне гадамі. Некаторая называюць мяне цярплівым рэжысёрам, але гэта не так. Ёсць вельмі класны вобраз, які выкарыстоўваў Уладзімір Маланкін: «Педагог і рэжысёр — гэта лужа. Трэба пад студэнта падцячы і ўвабрацца ў яго».

**— Ці можна з аднаго погляду разгледзець патэнцыял у чалавеку?**

— Залежыць ад таго, чым вымяраць. Калі прафесійным тэатрам, то праз некалькі сустрэч можна зразумець, ці здолее ён увогуле дарасці да прафесійнага тэатра, стаць майстрам. Думаю, што гэта нескладана, але гарантый даць немагчыма. Аднак патэнцыял ёсць ва ўсіх. Патэнцыял творчы. Калі чалавек пачынае займацца тэатрам, паўстаюць такія пытанні, як суіснаванне з калектывам, лідарскія якасці, уменне трываць, уменне давяраць, і разам з тым узнікаюць крытэрыі, якім трэба адпавядаць нават на ўзроўні студэнцкага тэатра, іх можна назваць прафесійнымі. На першых сустрэчах можна заўважыць прагу студэнта да творчасці, да сцэнічнасці.

Ну, а як праверыць астатняе? Выпусціць на сцэну. А там ён ці баіцца ўсяго і робіць недарэчнае, ці пачынае шукаць спосаб нешта выявіць. І гэта гаворка пра выразнасць, неабходную сцэне. Усё індывідуальна. Трэба зважаць на тое, чые цікавасці разглядаюцца: тэатра ці чалавека, які ўдзельнічае. І гэта розны патэнцыял. Я веру, што ў кожнага чалавека ён ёсць і кожны можа вырасці на столькі, на колькі магчыма. Што тычыцца патэнцыялу тэатра, то тут паўстаюць і патрабаванні, а гэтым патрабаванням адпавядаць могуць не ўсе. Таму ўзнікаюць пытанні: што такое студэнцкі тэатр і якім тэатрам займацца ў галіне студэнцкага? Можна гуляцца, можна выхоўваць, можна ратаваць, можна вучыць… Альбо рыхтаваць да тэатра: да таго, што студэнт выйдзе да гледача і сутыкнецца з цемрай, якая там існуе і паглынае так, што не вынырнуць. Пытанні экзістэнцыяльныя.

**— Часта аб студэнцкіх тэатрах адгукаюцца не вельмі пахвальна. Тут гаворка і аб прафесіяналізме акцёраў, і аб якасці і сур'ёзнасці пастановак. Як вы да гэтага ставіцеся?**

— Студэнцкі тэатр можна любіць, можна ненавідзець — я ўжо казаў. Трэба разумець, адкуль у чалавека сфарміравалася гэткае стаўленне, на падставе чаго ён робіць такія высновы. У студэнцкім тэатры вядома, як, дзеля чаго і на якім узроўні ўсё можна зрабіць. А такое крытычнае меркаванне падаецца трошкі абмежаваным, хоць у нейкім сэнсе магу з ім пагадзіцца. Часам і мне на студэнцкіх пастаноўках бывае сумна, нецікава. Менавіта тады ўзнікае пытанне: як займацца такім тэатрам? Можна прафесійна: і тады ён будзе расці да нейкай студыйнасці, лабараторнасці, а можна па-студэнцку. Тады хутчэй за ўсё будзе нейкая піянерыя, шкалярства дзеля важнай мэты. Мне падаецца, першы шлях больш цікавы і больш варты.

**— Як вы лічыце, з улікам эксперыментаў у студэнцкім тэатры больш свабоды, чым у прафесійным?**

— Усё залежыць ад людзей, якія гэтым займаюцца. Само пачуццё свабоды — тая якасць, якая альбо жыве ў людзях, альбо існуе фіктыўна. Можна гаварыць пра гэта, а ніякай свабоды можа і не быць у тым, што мы робім. У тэатры шмат дыктатуры, калі хтосьці павінен прыняць адказнае рашэнне. Інакш гэтыя бязмежнасць і свабода ўсё разнясуць. Таму катэгорыя вельмі складаная… Як яе ўвогуле сфармуляваць? Не думаю, што ў студэнцкім тэатры больш свабоды. Больш бязмежнасці, чым свабоды. Бо ніхто не ведае крытэрыяў, прыкладаў, патрабаванняў. Яна патрабуе дакладных працэсаў, вельмі моцнай працы над выбарам сродкаў выразнасці, тады яна дасягальная. Але ўсё залежыць ад людзей, якія збіраюцца разам. Што яны шукаюць? Дазваляюць творча праяўляцца ўсяму калектыву альбо адзін стварае, а ўсе астатнія — выканаўцы яго волі?

**— Ці магчыма вырасціць студэнцкі тэатр у студыйны ці прафесійны?**

— Я сказаў бы так: студэнцкі тэатр можна вырасціць. Кропка. А ўва што яго можна вырасціць — гэта іншае. Сам студэнцкі тэатр можа быць шчырым, адкрытым, класным. Пытанне, як ім займацца і што шукаць.

**— Ці можна назваць студэнцкі тэатр новым фарматам сучаснага тэатральнага жыцця?**

— У сённяшнім свеце столькі фарматаў, такая безліч, што новым яго назваць складана. Я пакінуў бы гэта на меркаванне гледачоў, якія дойдуць да нас. Мы спрабуем шукаць, спрабуем працаваць з новымі формамі, спрабуем несці адказнасць за тое, што робім, ставіць нейкія планкі, дарастаць да гэтых планак і зноў падымаць. Умовы жыцця такія, што ўсё мяняецца кожны дзень, і таму пакуль людзі ёсць, пакуль людзі гараць, пакуль людзі хочуць, мы будзем працаваць.

**Гутарыла Дар'я СУРНОВА,**
**фота аўтара**

# Варшаўская надзея

**Пакуль тэатры сышлі на «канікулы» і новы сезон пачнецца толькі праз некалькі тыдняў, ёсць час прыгадаць тое, чым запомніўся мінулы і якія пастаноўкі хацелася б наведаць ізноў. Зразумела, так бывае, калі пасля прагляду спектакля шкада расставацца з героямі, не хочацца вяртацца ў шэрую паўсядзённасць, а пытанні, узнятыя стваральнікамі, нагадваюць пра сябе самотнымі (ці не зусім) вечарамі. Напрыклад, што больш важна: аддацца пачуццям ці памятаць пра здаровы сэнс? І ці рэальна неяк сумясціць гэтыя паняцці? Адказ спрабуе даць знакамітая п'еса Леаніда Зорына «Варшаўская мелодыя», якую паставілі ў Новым драматычным тэатры.**

Галоўныя героі твора — маладыя людзі Гелена і Віктар. Яны пазнаёміліся выпадкова, падчас канцэрта ў філармоніі: полька, будучая спявачка, і маскоўскі студэнт вінаробнага аддзялення. Абодва толькі што перажылі Вялікую Айчынную вайну. Няпросты час, няпросты лёс... Ці могуць абставіны перашкодзіць пачуццю кахання? Здаецца, не, аднак не ўсё так бясхмарна, як можа падацца на першы погляд…

Акцёраў на сцэне ўсяго двое, аднак гэта не становіцца перашкодай на шляху да сэрца гледача. Выканаўцы — Надзея Анцыповіч і Арцём Пінчук — ствараюць добры творчы тандэм, якому безагаворачна верыш. Пужаешся разам з Геленай, калі яна ўспамінае жахі вайны. Смяешся з яшчэ няўмелых спроб Віці пацалаваць каханую (галоўнае, спытаць несвоечасова «Колькі часу?»). Заміраеш у чаканні, калі здаецца, што яшчэ крыху — і Геля паверыць Віктару, а значыць, яны стануць бліжэй. Хвалюешся разам з абодвума персанажамі, калі яны сустракаюцца праз дзесяць гадоў…

Рэжысёр-пастаноўшчык Сяргей Кулікоўскі выкарыстаў цікавы мастацкі прыём: ён разбіў фінальны эпізод на дзве часткі. З першай пачалася п'еса, а другая, як і належыць, засталася ў канцы. Такім чынам, глядач ведаў, да чаго давядзе гісторыя Гелі і Віктара. Магчыма, нехта не зразумее, як гэта — адразу ведаць фінал сюжэта і заставацца зацікаўленым падчас аповеду. Аднак сумесная праца акцёраў і рэжысёра не можа не крануць чулай чалавечай душы. Быццам назіральнік у зале ўжо не звычайны глядач, а ўдзельнік падзеі: вось юнакі яшчэ толькі знаёмяцца, потым шпацыруюць па выстаўцы ў музеі, затым жывуць разам, збіраюцца ажаніцца. І раптам — новы закон... Закон, які падзяляе жыццё на «да» і «пасля», перакрэслівае ўсе надзеі на светлую будучыню.

*Фота з сайта newtheatre.by.*

*Сцэна са спектакля «Варшаўская мелодыя».*

Сёння ўжо цяжка такое ўявіць, аднак у СССР у 1947 годзе сапраўды быў прыняты закон аб забароне шлюбаў паміж грамадзянамі СССР і замежнікамі. Ён і лёг у аснову сюжета п'есы. Закон адмянілі хутка пасля смерці Сталіна, аднак хутчэй фармальна, бо стаўленне да гэтага пытання засталося тое ж.

Віктар не змог вырашыць праблему шлюбу з Геляй, і ім давялося расстацца. Пасля вучобы яна вярнулася ў Варшаву, а ён з'ехаў у Краснадар. Прайшло дзесяць гадоў… Віця прыехаў у камандзіроўку ў сталіцу Польшчы і адразу пайшоў да Гелі. Жыццё абодвух змянілася за гэты час. Аднак нягледзячы на тое кожны год у дзень памяці Святой Ядвігі Гелена пакідала ёй цыдулкі з просьбай вярнуць каханага. Стаўшы прафесійнай спявачкай, яна баіцца прыехаць з гастролямі ў СССР, каб не спаткаць там яго. Апошняя сустрэча праз яшчэ дзесяць гадоў акунае ў рэчаіснасць і завяршае дзею. Здаецца, закон ужо не працуе, з асабістым жыццём таксама ўсё зразумела, і што цяпер перашкаджае паспрабаваць яшчэ раз? Аднак… Не.

Як некалі казаў сам Леанід Зорын, галоўнае ў спектаклі — тэма безвыходнасці. «Каханне асуджана, таму што абставіны здолеюць вас растаптаць паравым катком. І, зрабіўшы сваю працу, яны быццам бы задаволена пацiраюць рукі над вашым прахам і над прахам вашага пачуцця. І два чалавекі, калі яны, нарэшце, сустракаюцца, могуць злучыцца. Але ўжо няма чым злучацца».

Пасля спектакля доўга разважаеш над пытаннем, агучаным у пачатку: што б сам зрабіў на месцы Віці — аддаўся пачуццям ці своечасова ўспомніў пра здаровы сэнс і не шукаў бы сустрэчы наогул? І як даравацъ і прыняць учынак Віктара, які спарадзіў такую жорсткасць для абодвух персанажаў? Няхай кожны знойдзе адказы на гэтыя пытанні сам.

**Аляксандра ГРАМЫКА**

# Змагаліся словам

## Калекцыя падпольнага перыядычнага друку

**У фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сярод асабістых архіваў дзеячаў навукі і культуры захоўваецца збор гісторыка, акадэміка АН БССР, доктара гістарычных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Івана Краўчанкі (1902 — 1979).**

*Партызанскія лістоўкі.*

Калекцыя Івана Краўчанкі — плён шматгадовай працы па пошуку і збіранні падпольнага перыядычнага друку ваенных часоў — паступіла ў 1980 годзе. У збор уваходзяць 33 назвы газет, якія друкаваліся на акупіраванай тэрыторыі з 1942 па 1944 гады, лістоўкі, насценгазеты, успаміны народных мсціўцаў, спісы атрадаў, партызан, справаздачы, дакладныя запіскі і інш. На многіх рарытэтах — асабістыя пазнакі Івана Сяргеевіча.

Ёсць і нумары падпольнай газеты «Звязда», органа Мінскага гаркама партыі, за 1942—1944 гады. З пачатку вайны газета выходзіла ў Мінску ва ўмовах глыбокага падполля. Усяго выйшла чатыры нумары; пяты, падрыхтаваны ўжо да друку, не пабачыў свет. У ноч на 26 верасня 1942 года гестапаўцы арыштавалі 21 падпольшчыка. У фашысцкія засценкі былі кінуты ўсе члены Мінскага падпольнага камітэта і сакратары гарадскіх райкамаў партыі.

Сярод архіўных дакументаў — пісьмо былога ўдзельніка мінскага падпольнага камітэта У. Сайчыка (падпольная мянушка «Стары»), адрасаванае Ц. Гарбунову, сакратару ЦК КПБ. Яно сведчыць пра працу друкарні газеты «Звязда» ў падполлі. У лісце падаюцца звесткі аб выхадзе першага нумара ў сярэдзіне мая 1942-га. Гэтую газету набралі ў друкарні імя Сталіна падпольшчыкі Б. Пупко і М. Воранаў пры дапамозе Б. Гофман. Свае кватэры для друкавання падпольнай «Звязды» давалі Ц. Трафімюк, А. Грышын, Воранавы, Т. Якавенка, П. Хадасевіч і інш. Ва ўмовах падполля газета выйшла агульным тыражом звыш 10 000 экзэмпляраў.

Аднаўленая «Звязда» стала выходзіць у канцы 1942 года ў зоне размяшчэння партызанскіх злучэнняў. Цэлыя суткі ў падпольнай рэдакцыі-друкарні, што размясцілася ў вясковым доме на Любаншчыне, набіралі і друкавалі першы ў партызанскай зоне нумар «Звязды». Выйшаў ён 27 студзеня 1943 года і адразу быў накіраваны ў партызанскія брыгады і атрады, у гарады і вёскі.

Сярод рукапісных дакументаў архіва Івана Краўчанкі — справаздачы ваенных карэспандэнтаў, якія працавалі ў падпольных рэдакцыях. Напрыклад, рэдактар газеты «Народны мсцівец» М. Дастанка распавядаў, як у снежні 1942-га на востраве ў Загальскіх балотах (Любанскі раён) абсталявалі друкарню. Шрыфты партызаны здабылі ў нямецкай друкарні ў Любані, станок зрабілі самі. У сакавіку 1943 года І. Кананові́ч, сакратар Слуцкага падпольнага райкома КП(б)Б, перадаў у друкарню партатыўную машынку, дастаўленую з Масквы. М. Дастанка ўспамінае: «Па пояс у балотнай вадзе мы прабіраліся з вострава на востраў. У адным месцы фашысты нас моцна "зажучылі", як гаварылі мы пасля жартуючы. Становішча стваралася пагражаючае. З плячэй знялі сухары, але не пакінулі шрыфт. Сем дзён у балоце не было ў нас крошкі хлеба, але за плячыма быў шрыфт…»

Адной з самых распаўсюджаных форм падпольнага друку былі насценныя газеты і баявыя лісткі, якія інфармавалі партызан пра становішча на фронце, у атрадзе, асвятлялі бытавыя пытанні. Напрыклад, насценная газета «Сталінец» (1943, № 28), орган партыйнай і камсамольскай арганізацыі партызанскага атрада імя Кірава, размясціла спіс лепшых партызан-падрыўнікоў, якія неаднаразова бралі ўдзел у знішчэнні варожых эшалонаў. Газета, няблага афармленая, надрукавана на машынцы, яе калонкі наклеены на вялікі аркуш глянцавай паперы.

Баявыя лісткі былі меншымі па памеры, але адказвалі на тыя ж пытанні, што і насценныя газеты. У баявым лістку «Чапаевец» (№ 10), органе партыйна-камсамольскай арганізацыі партызанскага атрада імя Чапаева, распавядаецца пра мужнасць камандзіра ўзвода А. Федарука, які загінуў у баі. Артыкул «Баявыя справы нашых камсамольцаў» расказвае пра поспехі партызан пры правядзенні дыверсій.

У калекцыі гісторыка захоўваюцца партызанскія лістоўкі 1941—1944 гадоў. Сярод дакументаў — лістоўкі Барысаўскага падпольнага партыйнага камітэта, Снядаўскага падпольнага райкама КП(б)Б і Снядаўскага антыфашысцкага камітэта, Смалявіцкага падпольнага райкама КП(б)Б і ЛКСМБ, Брэсцкага абкама КП(б)Б і Брэсцкага антыфашысцкага камітэта, Ліозненскага РК КП(б)Б, Клецкага райкама КП(б)Б, Слуцкага РК КП(б)Б, Вілейскага абкама КП(б)Б і інш.

Падпольныя газеты і лістоўкі дастаўляліся ў Мінск і іншыя гарады Беларусі самымі рознымі спосабамі. «Баявое» слова праносілі праз нямецкія пасты ў малочных бідонах з падвойным дном, закладвалі ў пустацелую дугу альбо аглоблю сялянскага воза.



*Падпольная друкарня Старобінскага РК КПБ.*

Газеты з асабістага архіва Івана Краўчанкі ўзбагацілі калекцыю партызанскага друку часоў Вялікай Айчыннай вайны, якая захоўваецца ў фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі і налічвае 570 нумароў падпольных партызанскіх і прыфрантавых газет. Яны ўведзены ў навуковы ўжытак, алічбаваны і прадстаўлены ў факсімільным выданні «І паўстаў народ…» (Мінск, 2005), складзеным супрацоўнікамі бібліятэкі.

**Алена ДЗЕНІСЕНКА**
**Фота даслана аўтарам.**

# Далучыць да гісторыі

## Праз назвы вуліц, помнікі, мемарыяльныя знакі

**З пухавіцкім, рудзенскім Азярычына звязана шмат цікавага і адметнага на розных этапах гістарычнага развіцця. Паселішча мае ўзрост амаль 600 (!) гадоў. Не так даўно ўраджэнцы Азярычына — браты Зміцер і Юрась Санько — выдалі ўнікальную для беларускага вясковазнаўства сапраўды энцыклапедычную біяграфію роднай вёскі.**

Гісторыка-краязнаўчая манаграфія, дзе знайшлося месца і археалогіі ў звязку з Азярычына і яго ваколіцамі, і фальклору, этнаграфіі, займела шырокі розгалас сярод землякоў, у перыядычным друку, у сацыяльных сетках. Прэзентацыя выдання адбылася ў родным паселішчы. Што, відавочна, з'яўляецца вышэйшай адзнакай увагі да зробленага. Пра факт выдання кнігі напісала і мясцовая раённая газета — «Пухавіцкія навіны». Варта нагадаць, што Азярычына раней уваходзіла ў Рудзенскі раён, які цяпер не існуе.

Мемарыялізацыя гісторыі паселішча працягваецца. У пачатку чэрвеня ў вёсцы Азярычына ўрачыста адкрыты мемарыяльны крыж. Зрабіць гэта ўдалося супольна, дзякуючы ініцыятыве людзей, не абыякавых да роднай гісторыі, да памяці прашчураў, папярэднікаў. Імёны ініцыятараў праекта — у элементах помніка, што само па сабе таксама важна.

Наступным праектам, як ужо засведчана руплівымі азярычынскімі краязнаўцамі, павінен стаць помнік Аляксандру Ельскаму (1834 — 1916), краязнаўцу, пісьменніку, этнографу, фалькларысту, энцыклапедысту, чый прыватны музей існаваў не так далёка — у Замосці. Нарадзіўся Аляксандр Карлавіч у Дудзічах, зусім блізка ад Азярычына. Гэтыя мясціны звязаны з імёнамі многіх пісьменнікаў: Генадзя Кляўко, Уладзіміра Дудзіцкага, Пятра Рунца, Валерыя Ліпневіча, Андрэя Захаранкі, Віктара Казько, Яўгена Будзінаса, Уладзіміра Ляпёшкіна… Пералік можна доўжыць.

Азярычына, Дудзічы, Белькавічы, Грабень, Наваполле, Бахаравічы — сапраўднае літаратурна-мастацкае гняздо не толькі Пухавіччыны і нават Міншчыны, але і ўсёй Беларусі! Выдатна, што тут паўстаюць новыя артэфакты, якія захоўваюць гісторыю ў вечнасці, нагадваюць пра даты і імёны.

Нараджэнне адмысловага помніка ў Азярычына з першай вядомай згадкай паселішча падштурхнула да больш шырокіх разваг адносна мемарыялізацыі літаратурна-мастацкай прасторы гэтых мясцін. Падаецца, што лагічным было б у назвах вуліц такіх паселішчаў, як Азярычына, Бахаравічы, Дудзічы, Наваполле, Узляны, у гарадскім пасёлку Рудзенск, шырэй ушаноўваць імёны землякоў, ураджэнцаў краю, якія праславілі гэтыя мясціны.

У свой час Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей ладзіў па ўсёй акрузе мерапрыемствы, прысвечаныя Уладзіміру Ляпёшкіну, Генадзю Кляўко… У сярэдзіне 1990-х гг., дзякуючы актыўнасці ў тым ліку прыватнага выдавецтва «Паліфакт», прыватнага музея матэрыяльнай культуры «Дудуткі» была арганізавана (з падтрымкай Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, бібліятэкі ўніверсітэта) навукова-практычная канферэнцыя ў гонар Аляксандра Ельскага.

Удзельнікі канферэнцыі працавалі не толькі ў Мінску, але і на Пухавіччыне. Так, пра выключнае значэнне гэтых мясцін навукоўцы, даследчыкі ведаюць. Але як данесці інфармацыю да больш шырокай аўдыторыі, каб паўплываць на гістарычнае выхаванне насельніцтва, грамадства, нагадаць, што мы багатыя на таленты? Відавочна, рабіць гэта трэба праз назвы вуліц і ў невялікіх паселішчах — праз бюсты, помнікі, праз усталяванне мемарыяльных дошак, а таксама валуноў з тэкстам у дачыненні да той ці іншай асобы…

Але рэалізацыя такіх ініцыятыў магчыма толькі ў супольнай працы грамадзян і мясцовых улад.

**Ігнат ПРЫМАКА**

# Дом, дзе жыве натхненне

**На ўскрайку Слоніма ёсць Ніжні завулак. Сюды, у дом № 12, часта наведваюцца людзі з розных куткоў Беларусі. Каля веснічак іх сустракае гаспадыня Надзея Салейка. І з першых жа слоў гэтай прыветлівай жанчыны ўсе святлеюць тварамі — столькі прыязні і станоўчай энергетыкі яна вылучае.**

У двары — муж Віктар, зычлівы і сціплы. А двор поўны дзіваў. Тут са старых бярвенняў, карчоў і карэнняў створаны незвычайныя кампазіцыі. І паштовая скрынка, і арэлі, і альтанка, і лесвіца на другі паверх дома ўпрыгожаны фігуркамі жывёл, птушак, фантазійных казачных персанажаў.

*Работа Надзеі Салейка «Руплівая гаспадыня».*

На першым паверсе адзін пакой дома адведзены пад галерэю, дзе вісяць карціны Надзеі, якая пасля заканчэння Мінскага мастацкага вучылішча імя А. К. Глебава працуе ў розных тэхніках і жанрах. Сярод яе работ — класічныя партрэты, нацюрморты, пейзажы. Аднак межы акадэмічнай школы аказаліся цеснымі для мастачкі, таму ў сваіх работах яна шырока выкарыстоўвае авангардысцкія прыёмы. Гэта і спалучэнне абстракцыі з канкрэтыкай, і прымяненне кампрэсарнай тэхнікі раздування фарбаў, і новае бачанне і прачытванне антычных сюжэтаў, і «рэплікі» на палотны знакамітых мастакоў. У яе карцінах можна адшукаць рысы рэалізму, сюррэалізму, імпрэсіянізму, кубізму ды шмат чаго іншага.

Аднак таленты Надзеі на гэтым не вычэрпваюцца. Увесь другі паверх дома — працяг сямейнага музея. Менавіта сямейнага, таму што гарачы імпэт мастачкі ўцягнуў у вір творчасці таксама мужа і сына. Муж шмат займаецца разьбой па дрэве, а сын Пятро — ганчарствам. Таму экспазіцыя другога паверха і майстэрні здзіўляе наведвальнікаў рознымі прыдумкамі, разнастайнасцю форм і матэрыялаў. Муж і сын — саўдзельнікі самых нечаканых і незвычайных творчых знаходак і ўвасабленняў.

А фантазія мастачкі неабмежаваная. Гэта пра такіх, як Надзея — «і швец, і жнец, і на дудзе ігрэц». Ёй падуладны разнастайныя керамічныя вырабы, аздоба з прыродных матэрыялаў, мэбля са спілаў дрэў і карэнняў, народныя строі, выраб музычных інструментаў.



*Віктар і Надзея Салейка сустракаюць чарговых гасцей.*

Да ўсяго, яна піша вершы і ўжо выдала тры зборнікі. У вершах Надзеі — гумар, глыбокія роздумы пра лёсы людзей, партрэтныя замалёўкі, трапныя назіранні і значныя філасофскія высновы. За імі адчуваецца вялікая праца душы.

А яшчэ — спявачка з выдатным голасам, прычым адольваць нотную грамату і ігру на музычных інструментах пачала ў саракагадовым узросце. Піша і выконвае аўтарскія песні, якія многіх кранаюць за душу. Шмат паэтычных радкоў прысвяціла Надзея роднай зямлі, якая наталяе сіламі, дае творчы імпульс і натхненне. Возьмем песню «Мая Беларусь» — сапраўдны гімн Радзіме!

*Вяртаюся ў першы світанак,*
*Бо дыхаць магу толькі тут.*
*Даруеш, калі я не ўстану,*
*Падымеш, мая Беларусь.*

Прылучаная да культурнага асяродку, аўтар шмат разважае пра ролю культуры ў жыцці грамадства. Яна пераканана: культуру фарміруюць таленавітыя асобы. У вершы пра ўзроставыя межы Надзея так вызначае для сябе адказ на адно з галоўных пытанняў, над якім разважаюць людзі ва ўсе часы:

*Спытаеш: «А навошта жыць?»*
*Сказаць, што за мяжой ляжыць.*
*Пераступіць уласны скон —*
*За ім бязмежнасці палон.*

Сям'я Салейкаў захоўвае мову, народныя промыслы і традыцыі. У атрыманую ад продкаў спадчыну гэтыя людзі прыўносяць сваё, новае, тым самым развіваючы і ўзбагачаючы спрадвечныя беларускія рамёствы. У 2002 годзе Надзея стала членам Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці.

**Вольга ЖЫГАР,**
**фота аўтара**

# Агнём народжаныя цуды

**Каваль Міхаіл Ксёнда жыве ў аграгарадку Моталь Іванаўскага раёна. Перш чым заняцца кавальствам, паспрабаваў сябе ў лозапляценні. Планаваў рабіць мэблю... Аднак хутка зразумеў — не яго гэты занятак.**

*Міхаіл Ксёнда ў кузні.*

— Шчаслівы той, хто займаецца любімай справай, — зазначае майстар. — Тады і стомленасць ад працы толькі ў радасць. Ужо два гады атрымліваю вялікае задавальненне ад кавальства. Прычым душа больш цягнецца да гарачай коўкі. Халодная таксама мне падуладная, стварыў дзякуючы ёй шмат вырабаў — арэляў, сталоўтрансформераў, падставак для кветак. Аднак, лічу, сапраўдны каваль — той, хто працуе з горнам. Агонь робіць цуды з металам: ён становіцца вельмі пластычным. Бывае, выходжу з майстэрні выціснуты як лімон, а на душы радасць.

Майстар звычайна купляе метал ў Пінску ў спецыялізаванай краме. Чым таўсцейшы матэрыял, тым даўжэй служыць выраб. Спачатку каваль выразае неабходныя дэталі, потым выкоўвае ў горне. Шляхам коўкі наносіцца фактура. «Якасная фактура вызначае майстра, — разважае Міхаіл. — Далей у ход ідуць абцугі — надаю патрэбную форму дэталям. Адкаваныя элементы збіраюцца і фарміруюць выраб».

Назіраючы за тым, як Міхаіл шмат гадзін завіхаўся каля горна, каб зрабіць ружу, прыйшла да высновы: каваль — не толькі асілак, але яшчэ і фантазёр.

— Па-мойму, ружа атрымалася цудоўная, — спяшаюся пахваліць майстра.

— А мне пакуль не надта падабаецца. Яе патрэбна зрабіць яшчэ больш вытанчанай, — гаворыць каваль.

Праз некалькі секунд дадае:

— Сам па сабе працэс коўкі — хуткі. Зацягвае падрыхтоўчая і завяршальная праца. Бывае яшчэ, што ніяк не ідзе работа. Кавалі, як любыя творцы, залежныя ад натхнення. У такім выпадку бяру перапынак і п'ю гарбату. З мёдам. Дарэчы, пчалярства — гэта маё хобі, якім займаюся ўжо дванаццаць гадоў.

Чайны перапынак скарысталі і мы з Міхаілам. Але спярша таленавіты майстар нанёс фарбу і паціну на ружу, якая разам з іншымі кветкамі стане прыгожым букетам.

— Выкаваць — гэта адно. А вось пафарбаваць — асаблівы від мастацтва. Тут можна як папсаваць, так і выправіць пэўныя заганы. Таму я заўсёды самаўдасканальваюся...

Сёння аўтарскія работы мотальскага майстра запатрабаваныя не толькі ў Беларусі. Рэкламаваць сваю прадукцыю дапамагаюць сацыяльныя сеткі. Нядаўна Міхаіл Ксёнда браў удзел у фестывалі «Мотальскія прысмакі». Многія з тых, хто завітаў да яго, знайшлі цікавы сувенір.

**Наталля КРЫВЕЦКАЯ,**
**фота аўтара**

*Работа Міхаіла Ксёнды «Конік».*

# Простыя рэчы

# Выводзячы эпоху...

**Здавалася б, надзвычай складана цяпер знайсці аўтара, які, маючы камп'ютар, не набірае тэксты, а менавіта піша — ручкай, на паперы, як гэта рабілі ў мінулым стагоддзі (за выключэннем хіба што самага яго завяршэння)… Адусюль, дзе даводзіцца бываць — з кожнай камандзіроўкі альбо прыватнай вандроўкі — пісьменнік Алесь Бадак прывозіць аўтаручкі — у асноўным, падораныя, але часам набывае іх сам. Навошта мець іх так шмат, Алесь Бадак распавёў карэспандэнту «ЛіМа».**

*Фота Кастуся Дробава.*

**— Алесь Мікалаевіч, адзін з вашых твораў пачынаецца з таго, што галоўны герой бярэ новую аўтаручку, якую спецыяльна бярог для чагосьці адметнага, і пачынае пісаць аповед. Пачатак вельмі арыгінальны, але я была ўпэўнена, што вы ўсё выдумалі! Выходзіць, гэта праўда, што вы па-асабліваму ставіцеся да пісьмовых прылад?**

— Пішу я марудна, а самае складанае для мяне — прыдумаць пачатак. Што тычыць аповесці «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца»… Нейкія думкі, звязаныя з яе сюжэтам, сталі праясняцца ў маёй галаве яшчэ пад канец 1990-х гадоў (аповесць пабачыла свет на старонках часопіса «Маладосць» у 2007 годзе — ***заўв. рэд.***). Але яна ў многім аўтабіяграфічная, асноўнае дзеянне там адбываецца на мяжы 1970-х — пачатку 1980-х гадоў, і мяне доўга не пакідала сумненне, ці будзе сюжэт цікавы сённяшнім падлеткам. Бо ён пра іх, толькі ранейшых. Калі ўрэшце сеў за пісьмовы стол, каб пачаць пісаць, галоўнай праблемай стаў першы сказ — менавіта ён задае рытм усяму твору. Урэшце, сказ прыйшоў сам — «Я збіраю шарыкавыя аўтаручкі…» Напэўна, таму, што ў руках у мяне была аўтаручка.

Далей аповесць пайшла лёгка. Але тое не было фактам маёй біяграфіі — ручкі тады не збіраў, проста спадабаўся рытм і сказ. Калі аповесць была надрукаваная, у вобразе галоўнага героя чытачы ўбачылі мяне. Знаёмыя і сябры пачалі дарыць мне аўтаручкі — яны былі ўпэўненыя, што я распавядаў пра сваё захапленне. І тады падумаў: а чаму б і не? Бо насамрэч вельмі важна: якой ручкай і якім стрыжнем пісаць. Маладзейшыя пісьменнікі ўсё набіраюць на камп'ютары, таму не разумеюць падобных тонкасцей. Але я пішу ад рукі. І тут важна, каб падчас творчага працэсу цябе нішто не адрывала, не перашкаджала. Бо калі пачынаеш тэкст і раптам стрыжань дзярэ паперу ці перастае пісаць альбо аказваецца вельмі тлустым — гэта збівае з думкі. Што да хуткасці, то ёсць ручкі, якія могуць крыху запавольваць тваё пісьмо, ёсць, што наадварот — паскараюць яго, і гэта таксама варта ўлічваць. І вельмі важна, каб рытм ручкі адпавядаў рытму твайго аповеду. Таму заўжды адмыслова шукаю ручку для твора, доўга перабіраю. Тонкі стрыжань шкрабе. Тоўсты — запаволены. Люблю сярэдняе паміж імі. Гэта ж датычыць і формы ручкі: не люблю вельмі тонкія — іх не адчуваеш у руцэ — і асабліва тоўстыя, цяжкія — яны запавольваюць пісьмо. Не падабаюцца тыя, што пішуць светла-сіняй пастай. Але колер пасты не павінен быць і занадта кідкім, напрыклад, чырвоным, рэзаць вочы. Найбольш люблю чорныя — таму ў маёй калекцыі шмат з чорным стрыжнем. Ёсць і вельмі дарагія: але не таму, што імі напісана нешта адмысловае, што падабаецца больш, чым іншае, а таму, што імі вельмі лёгка пішацца. Калі казаць пра камп'ютар і клавіятуру, то адпаведнага адчування задавальнення падчас набору тэксту няма.

**— Вы пішаце толькі аўтаручкай?**

— Так, а потым набіраю з чарнавіка і праўкі ўношу на камп'ютары. Працаваць такім чынам прасцей, бо правак у мяне вельмі шмат. І чарнавікі не захоўваю. Зазвычай знішчаю.

**— А почырк у вас прыгожы?**

— Часам згадваю сустрэчу з Уладзімірам Юрэвічам, які доўгі час працаваў на радыё, вёў перадачу «Жывое слова». Калі я быў школьнікам, шмат пісаў, у тым ліку і на радыё. І ён сказаў мне тады: «Алесь, які ў цябе прыгожы почырк!» Але з часам ён зусім сапсаваўся. Рэч у тым, што калі трэба запісаць фразу альбо абзац, які толькі прыйшоў да галавы, зазвычай спяшаешся і табе вельмі цяжка спыніцца. Вось гэтая спешка і прывяла да таго, што літары пачалі скакаць: калі выводзіць кожную, можна страціць настрой, з якім пішаш…

**— А ці гэтак жа адмыслова вы выбіраеце паперу, на якой пісаць?**

— Так. Усё лішняе на ёй — непрымальнае. Таму не люблю разлінееных сшыткаў, незалежна ад таго, у клетачку яны ці ў лінеечку. Аркуш павінен быць чыстым, памер — А4 — менавіта той, на якім можна рабіць шмат правак.

**— Ручка ў вас пры сабе ёсць заўжды?**

— Не. Я пішу толькі дома. У дарозе зазвычай думаю. Бо калі думаю, не магу сядзець — тут патрэбен рух, пажадана шпацыр па вуліцы. Часам нават не ведаю, куды іду. Не заўважаю, як далёка адышоў — для цела патрэбны той фізічны рытм, які адпавядае рытму ў вершы і ў прозе. Большасць вершаў, пачатак іх, канкрэтныя радкі, сюжэты і вобразы прыдуманыя менавіта ў дарозе. Калі саджуся запісваць, бывае, раблю паўзу і пачынаю хадзіць з пакоя ў пакой...

**— Гавораць, у вашай калекцыі больш ад тысячы аўтаручак…**

— Так, таму я іх ужо амаль і не набываю. Асабліва люблю ручкі старыя. Яны ж таксама, як і любая рэч, нясуць на сабе адбітак свайго часу. А паколькі аўтаручкі, што называецца, мой рабочы інструмент, то і стаўленне да іх асаблівае. Гэтак жа стаўлюся і да кніг: самы хвалюючы момант для мяне — паход у букініст. Невядома, хто чытаў старую кніжку, выдадзеную паўстагоддзя таму, што трапіла да цябе ў рукі — як шмат тут таямніцы! Прыцягвае іншы час і стагоддзе. Як і ў ручках, так і ў іншых старых прадметах. Таму ў мяне шмат даўніх дакументаў і фотаздымкаў — часам я не ведаю людзей, чые выявы захаваліся, але прыцягвае тая эпоха, якая за імі стаіць. Маю часопісы, напрыклад, «Полымя» 1948 года, «Бярозка» 1930 – х гадоў — з хваляваннем глядзіш на паперу, на творы… І хай сабе яны ёсць і ў кніжным фармаце новага выдання — такога трапяткога адчування не выклікаюць, як пад шурпатай, пажаўцелай ад даўнасці вокладкай… Не за гарамі той час, калі рарытэтам стануць і ручкі — каштоўнасць іх павялічыцца. Асабліва для тых, хто любіць чытаць і пісаць. Хоць часам жартую: шкада, што не пачаў свайго «Адзінокага васьмікласніка» сказам: «Я збіраю залатыя манеты».

**Гутарыла Яна БУДОВІЧ**

---

**зваротная сувязь**

# Што граць спякотным летам

Праграма «Літаратурная анталогія» на канале «Культура» Беларускага радыё зноў звяртаецца да старонак рамана Івана Мележа «Подых навальніцы». У «Радыёбібліятэцы» гучаць эсэ з кнігі Янкі Сіпакова «Зялёны лісток на планеце Зямля». Празаічныя творы кароткіх форм чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных.

Змест праграмы «Радыётэатр плюс» у суботу складуць інсцэніраваныя старонкі аповесці Фёдара Абрамава «Спякотным летам», у нядзелю — радыёпастаноўка «Пешшу праз Галактыку» паводле твора Яўгена Радкевіча.

Па выхадных гучыць «Дзіцячы радыётэатр». Гэтым разам яго прыхільнікі пачуюць пастаноўкі «Выбірай і грай» па творы Здзіслава Стомы, «Мічык-флічык» Яна Маліка, «Мілавіца» Уладзіміра Дубоўкі, а таксама рускую народную казку «Мікіта Кажамяка». Чытанні для маленькіх ладзяцца таксама па буднях у межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — прагучаць старонкі кнігі Івана Юркіна «Маша і яе сябры». Штовечар выходзіць «Вячэрняя казка» на добры сон.

Для аматараў паэзіі па выхадных выходзіць праграма «Прачулым радком», якая на гэты раз прапануе вершы Рыгора Барадуліна.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі і навінкамі беларускіх выдавецтваў, а таксама са зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

У нядзелю ўвазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Сюжэт для вечнасці». Госць эфіру радыёверсіі праграмы «Суразмоўцы», што гучыць у нядзелю і сераду, — кандыдат філалагічных навук Алена Багамолава.

Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

**ЛіМ КАЛЯНДАР**

**14 жніўня** — 85 гадоў з дня нараджэння Івана Шпакоўскага (1936—2008), літаратуразнаўца, крытыка.

**15 жніўня** — 190 гадоў з дня нараджэння Вінцэся Каратынскага (1831—1891), беларускага і польскага паэта, публіцыста, перакладчыка.

**15 жніўня** — 130 гадоў з дня нараджэння Таццяны Лапацінай (1891—1980), дзеяча самадзейнага мастацтва, кампазітара-аматара, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

**15 жніўня** 80-годдзе адзначае Таццяна Кабржыцкая, літаратуразнаўца, крытык, перакладчык.

**16 жніўня** — 80 гадоў з дня нараджэння Святланы Катковай (1941—2020), мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісца.

**16 жніўня** спаўняецца 65 гадоў з дня заснавання Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў Мінску. Адкрыты для наведвання 4 снежня 1959 г.

**16 жніўня** 55-годдзе святкуе Ірына Дубашынская, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**18 жніўня** 75-годдзе адзначае Алесь Марціновіч, беларускі пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**18 жніўня** — 105 гадоў з дня нараджэння Анатоля Рачова (1916—1999), флейтыста, заслужанага артыста БССР.

**18 жніўня** — 95 гадоў з дня нараджэння Віктара Шаўкалюка (1926—2019), артыста аперэты, заслужанага артыста БССР.

**18 жніўня** 80-гадовы юбілей адзначае Сямён Букчын, празаік, крытык, публіцыст.

**19 жніўня** — 100 гадоў з дня нараджэння Аляксандры Манаенкавай, мовазнаўцы.

**19 жніўня** — 80 гадоў з дня нараджэння Мікалая Ткачова (1941—2011), жывапісца.

**19 жніўня** 75-годдзе святкуе Віктар Гардзей, паэт, празаік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**20 жніўня** — 100 гадоў з дня нараджэння Ціхана Панцюшэнкі (1921—2004), празаіка.

**20 жніўня** — 85 гадоў з дня нараджэння Яўгена Крупенькі (1936—1990), паэта, перакладчыка.

**Выходзіць з 1932 года**

**Заснавальнікі:**
**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»**

**Галоўны рэдактар**
**Аляксей Іванавіч ЧАРОТА**

**Рэдакцыйная калегія:**
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

**Адрас рэдакцыі:**
**Юрыдычны адрас:**
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

**Адрас для карэспандэнцыі:**
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

**Тэлефоны:**
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснікі галоўнага рэдактара — 377-99-72, 224-66-74
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

**Падпісныя індэксы:**
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Выдавец:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк
12.08.2021 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 653

**Друкарня** Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1.
Індэкс 220013

Заказ — 2051

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.